Тое, што безнаяўныя разлікі — гэта зручна, многія ўжо зразумелі. Зарплаты ўсім налічваюць на пластыкавыя карткі, і карыстацца імі за некалькі гадоў мы навучыліся. СТАР 2

«З-за стэрэатыпаў і негатыву ў дачыненні да сябе многія ВІЧ-інфіцыраваныя нават не звяртаюцца па лячэнне, баяцца гаварыць пра свой дыягназ. СТАР 5

Балет «Вітаўт» глядзець можна з гонарам: яго адчуюць тыя, для каго гісторыя вышэй за харэаграфію, а пачуццё патрыятызму вышэй за мэту тэатра пераварочваць душу. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

7 ВЕРАСНЯ 2013 г. СУБОТА № 168 (27533) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ДЭВАЛЬВАЦЫІ РУБЛЯ ПАД ПАТРЭБЫ ЭКАНОМІКІ НЕ БУДЗЕ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў учора прадпрыемства «Мотавела», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з вынікамі фінансава-гаспадарчай дзейнасці і перспектывамі развіцця прадпрыемства. Размова таксама ішла пра стан, праблемы і перспектывы развіцця прамысловасці Мінска ў цэлым. У час наведвання «Мотавела» Прэзідэнту таксама было даложана аб выкананні ўказа ад 26 ліпеня 2007 года № 354, які тычыўся пытанняў далейшага развіцця прадпрыемства. У адпаведнасці з гэтым дакументам, дзяржаўны пакет акцый таварыства быў прададзены інвестару — аўстрыйскай фірме АТЭК Holding GmbH. Пры гэтым адной з найбольш важных умоў продажу было захаванне спецыялізацыі ААТ «Мотавела» і ўкладанне ў 2007—2012 гадах у яго развіццё не менш як $20 млн. Таксама планавалася, што прадпрыемства павінна было летась выйсці на аб'ём вытворчасці ў 500 тыс. веласіпедаў і 30 тыс. матацыклаў. Аднак, як далажылі Прэзідэнту, пастаўленыя ўмовы выкананы толькі часткова.

Фота БЕЛТА.

Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэя Кабякова, далёка не ідэальны і фінансавы стан прадпрыемства, высокі ўзровень дэбіторскай запазычанасці.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што не ўсе плошчы прадпрыемства задзейнічаны пад вытворчасць, як было дамоўлена, і каля чвэрці плошчаў здаецца ў арэнду. Прэзідэнт запатрабаваў безумоўнага выканання планаў па развіцці акцыянернага таварыства, яшчэ раз падкрэсліў, што павінна прасочвацца дынаміка па выхадзе на запланаваныя аб'ёмы вытворчасці.

НІЯКАЙ ШТУЧНАЙ ДЭВАЛЬВАЦЫІ РУБЛЯ

Беларускі рубель пад патрэбы прамысловасці дэвальвавацца не будзе, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ААТ «Мотавела». «Беларускі рубель будзе або ўмацоўвацца, або аслабляцца ў залежнасці ад попыту і прапановы»,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што цяпер, з-за ўзрослага попыту на валюту, беларускі рубель крыху аслабеў. «Гэта жалезная задача Нацыянальнаму банку: ні ў якім разе нічога штучна не стрымліваць і не марнаваць золатавалютныя рэзервы»,— сказаў Прэзідэнт. «Гэта святое. Я не магу запасы, прызначаныя на самыя цяжкія часы і на тры месяцы імпарту нафты, газу, лекаў, вам аддаць,— адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў.— Вы робіце трактары, аўтамабілі, шмат чаго іншага: ідзіце, прадавайце і жывіце на гэтую валюту».

«Ніякай штучнай дэвальвацыі, каб вам жыццё палегчыць і экспарт палепшыць, не будзе»,— падкрэсліў Прэзідэнт. «Я краіну не магу кінуць пад ногі пяці дырэктарам, якія ў вас сёння нічога не робяць»,— дадаў кіраўнік дзяржавы. Ён паабяцаў адстаўку членам урада і дырэктарам прадпрыемстваў за невыкананне да 1 студзеня 2014 года заданняў па разгрузцы складоў і росту прамысловай вытворчасці. «Калі 1-га студзеня вы не выйдзеце на тое, што абяцалі,— ні Сямашкі, ні дырэктараў на гэтых пасадах не будзе. І яшчэ ацэнку дадзім прэм'ер-міністру: можа быць, і ён разам з вамі пойдзе. У мяне выйсця іншага няма»,— сказаў кіраўнік дзяржавы. «Вы на мяне не крыўдуйце, гэта кадравая палітыка»,— адзначыў Аляксандр Лукашэнка.— «Кабякоў ужо сваё атрымаў — за тое, што некалькі вызваленых ад пасад чалавек трапілі на цёплыя месцы. Калі, дапусцім, дырэктар маторнага завода — слесар, значыць, ён пойдзе працаваць слесарам або брыгадзірам слесараў, калі Сямашка — канструктар, ён пойдзе працаваць канструктарам, калі захоча».

Прэзідэнт папярэдзіў чыноўнікаў аб недапушчальнасці стварэння якіх-небудзь камерцыйных структур для далейшага працаўладкавання ў іх. «Цёплых месцаў, а не дай Бог камерцыйных структур, для вас не будзе, таму што гэтая камерцыйная структура будзе знішчана імгненна, калі яны возьмуць на працу без майго ведама людзей з кадравага рэестра. У мяне няма іншага выйсця: ці вы працуеце і даяце вынік, ці сыходзіце. Таму што некаторыя стварылі дзесьці структуры і сёння сядзяць і думаюць: добра, не тут, дык там я ўладкуюся. Не! Выпрацавана сістэма, мы гэта ўсё адсочым,— сказаў Прэзідэнт.— Толькі чалавечы, прыстойны падыход. Я разумею складанасці і цяжкасці, я бачу, як свет сёння боўтаецца ў гэтым крызісе, але я бачу і іншае,— дадаў кіраўнік дзяржавы.— Вы добра ідзяце па выкананні тых абяцанняў, якія вы з Мясніковічам далі на апошняй нарадзе. Гэта значыць, мы ўжо на 1 кастрычніка павінны бачыць паўкроку, а да 1 студзеня зробім значны рывок і выйдзем на тое, што абяцалі на нарадзе»,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад чыноўнікаў плёну такой працы і прытоку ў краіну валютных сродкаў. «Ваша прамая задача — гандляваць. Якая праблема? У нас, напэўна, у 50-ці, калі не больш, краінах свету ёсць прадстаўнікі на ўзроўні паслоў. Бярыце і гандлюйце калійнымі ўгнаеннямі, што, дарэчы, сёння і пачалі рабіць,— сказаў Прэзідэнт. — Напружвацца павінны ўсе. Сёння ўсе намеснікі міністра замежных спраў ездзяць па краінах і вядуць за руку прадстаўнікоў Беларускай калійнай кампаніі, каб заключыць дагаворы і пераадолець гэты крызіс».

Кіраўнік дзяржавы таксама закрануў тэму продажу «Беларуськалія». «Кажуць, чаму ён не прадае «Беларуськалій»? Слухайце, гэта ж ідыётам трэба быць, нават да гэтага развалу, каб, калі цана прадпрыемства мінімальная, я ўзяў ды і прадаў яго»,— сказаў Прэзідэнт.

ВЫЯЗНУЮ ПОШЛІНУ — ДЛЯ ТЫХ, ХТО ВЫЯЗДЖАЮЦЬ ЗА МЯЖУ ПА ПАКУПКІ

Аляксандр Лукашэнка прапаноўвае ўвесці выязную пошліну для тых беларусаў, якія выязджаюць за мяжу па пакупкі. «Чаму мы ствараем умовы для ўвозу ў краіну імпарту, яшчэ і на льготных умовах? У нас свае халадзільнікі, навошта нам ільготныя ўмовы ствараць для ўвозу халадзільнікаў з-за мяжы?»

«Нас крытыкуюць — бедная, жабрацкая краіна, а нашы людзі да $3 млрд за год вывозяць за мяжу ў Еўрасаюз і прывозяць тавары, якія мы таксама выпускаем»,— падкрэсліў Прэзідэнт.— Дык вось, я даўно даручыў: выязджаеш за межы, усё роўна па што, заплаці выязную пошліну. Гэта будзе так: мы цябе на мяжы абслугоўваем — 100 долараў з носа плаці і едзь сабе за мяжу,— сказаў Аляксандр Лукашэнка.— Тады ён прыйдзе ў нашу краму і купіць наш халадзільнік, а не будзе цягнуць з Еўрасаюза барахло невядома якой вытворчасці. А яны там будуць сядзець і паціраць рукі: 3 млрд долараў увезлі ім грошай, у іх развіваецца гандаль, вытворчасць, а мы боўтаемся тут, як дурні»,— сказаў кіраўнік дзяржавы.

Фота БЕЛТА.

БУЛЬБА НАША — СІЛА НАША

Навучэнцы Барысаўскага дзяржаўнага каледжа дапамагаюць убіраць бульбу на палях ААТ «МІРАПОЛЛЕ» (Барысаўскі раён). Такім чынам студэнты маюць магчымасць зарабіць грошы для сябе, а таксама нарыхтаваць гародніну для каледжа. Усяго на прадпрыемстве засаджана бульбай каля 100 гектараў зямлі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ПЯСКОЎ, прэс-сакратар прэзідэнта РФ

«Адносіны паміж дзяржавамі — асабліва такімі саюзнымі дзяржавамі, як Расія і Беларусь, — заўсёды прыярытэтныя ў параўнанні з адносінамі паміж нейкімі карпарацыямі, прадпрымальнікамі. Таму, безумоўна, не трэба нейкім чынам экзальтаваць сітуацыю вакол справы Сулеймана Керымава, трэба ва ўсім спакойна разабрацца. Я не сумняваюся, што нашы кампетэнтныя органы будуць у кантакце з беларускімі калегамі і атрымаюць усю інфармацыю».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.09.2013 г.

Долар ЗША	9040,00	▲
Еўра	11860,00	▼
Рас. руб.	270,50	■
Укр. грыўня	1105,61	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 20°
Віцебск	+ 18°
Гомель	+ 16°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 17°
Мінск	+ 19°

ГУМАНІТАРНАЯ ДАПАМОГА ДЛЯ АМУРСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Самалёт з гуманітарнай дапамогай для Амурскай вобласці вылецеў учора ў 13.10 з Нацыянальнага аэрапорта Мінск, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Гуманітарная дапамога ў Амурскую вобласць была накіравана па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Як расказаў прэс-сакратар МНС Беларусі Віталь Навіцкі, у Благавешчанск Іл-76 даставіць 43 т грузу — максімум, які можа транспартаваць самалёт.

У пацярпелыя раёны Амурскай вобласці самалёт даставіць дзіцячае харчаванне (43 т падрыхтаваў аршанскі завод). Акрамя таго, Беларусь адправіла чыгуначным транспартам мясныя кансервы і харчовую бульбу. Суправаджаюць груз работнікі МНС Беларусі на чале з намеснікам міністра МНС Аляксандрам Ганчаровым. «Ад такіх катастроф, што здарылася ў Амурскай вобласці, ніхто не застрахаваны, і толькі разам можна справіцца з такімі выпрабаваннямі»,— сказаў ён. Аляксандр Ганчароў адзначыў, што міністры МНС Беларусі і Расіі правялі тэлефонную размову, у час якой расійскі калега падзякаваў беларускаму народу за спагаду і дапамогу Амурскаму краю ў цяжкай сітуацыі. Намеснік міністра МНС Беларусі падкрэсліў, што расійскія калегі спраўляюцца з пастаўленымі перад імі задачамі. Ёсць патрэба менавіта ў харчовай дапамозе, асабліва дзецям. Таму ў першую чаргу Беларусь накіравала ў Амурскую вобласць дзіцячае харчаванне. Таксама груз суправаджае старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Аляксандр Зазуля. «Перад нашай місіяй стаіць задача ад імя беларусаў падтрымаць нашых сяброў, братоў-расіян. Калі прыходзіць бяда, адлегласці ніхто не бярэ ў разлік»,— адзначыў ён.

Фотаздымкі БЕЛТА.

КАРАТКА

Суд Партызанскага раёна Мінска не задаволіў скаргу абароны фігуранта «калійнай» справы Уладзіслава Баўмгертнера аб змяненні меры стрымання.

Тыдзень беларускай кухні правядуць з 7 па 15 верасня дванаццаць кавярняў і рэстаранаў Мінска, дзесяць з іх размешчаны на тэрыторыі Верхняга горада. Каля ўваходаў ва ўстановы грамадскага харчавання, якія далучыліся да праекта, будуць вывешаныя спецыяльныя плакаты з выявамі страў нацыянальнай кухні.

У Астравецкім раёне будуць вырошчваць і перапрацоўваць абляпіху. Ужо закладзены гадавальнік, вырошчваецца 5 тыс. саджанцаў. Плануецца стварыць поўны цыкл вытворчасці абляпіхі і прадукцыі яе перапрацоўкі. Увесну 2014-га на плошчы 1 га будзе разбіты матачна-чаранковы сад.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБАМА ЗАПАТРАБАВАЎ ПАВЯЛІЧЫЦЬ СПІС ЦЭЛЯЎ ДЛЯ ЎДАРУ ПА СІРЫІ

Прэзідэнт ЗША Барак Абама, які знаходзіцца цяпер у Санкт-Пецярбургу на саміце G20, пакуль Кангрэс вырашае пытанне аб магчымасці нанясення ўдару па Сірыі, накіраваў у Пентагон патрабаванне пашырыць спіс патэнцыйных цэляў у гэтай блізкаўсходняй краіне, піша газета The New York Times. Гаворка ідзе пра павелічэнне спіса з 50 аб'ектаў на тэрыторыі Сірыі, якія былі вызначаны французскімі саюзнікамі амерыканцаў. Акрамя таго, адміністрацыя ўпершыню загаварыла аб выкарыстанні амерыканскіх і французскіх самалётаў. Раней меркаваўся толькі запуск з караблёў у Міжземным моры крылатых ракет «Тамагаўк» .

У КАЎНАСЕ Ў ГРАМАДСКІХ МЕСЦАХ УСТАЛЯВАЛІ 5 ДЭФІБРЫЛЯТАРАЎ

Каўнас стаў першым горадам у Літве, дзе ў грамадскіх месцах усталявалі пяць дэфібрылятараў — прыбораў, якія могуць выратаваць жыццё ў выпадку парушэння сардэчнага рытму. Дэфібрылятар знаходзіцца на Каўнаскай аўтастанцыі, на чыгуначнай станцыі, у гандлёвым цэнтры Akropolis, у рэстаране Sadute ў старым горадзе і рэстаране на Лайсвес алеі Miesto sodas. Нагадаем, што ўсталяваны ў аэрапорце Франкфурта дэфібрылятар летась выратаваў жыццё вядомаму каўнаскаму кардыёлагу Вітаўтасу Грубляўскасу.

ЮАНЬ УПЕРШЫНЮ ЎВАЙШОЎ У ДЗЯСЯТКУ САМЫХ ТАРГАВАНЫХ СУСВЕТНЫХ ВАЛЮТ

Кітайскі юань абагнаў расійскі рубель, шведскую крону і новазеландскі долар і ўпершыню ўвайшоў у дзясятку самых таргаваных сусветных валют, піша The Wall Street Journal. Валюта КНР паднялася з 17-га на 9-е месца ў рэйтынгу Банка міжнародных разлікаў, што публікуецца раз на тры гады. За тры гады абарот таргоў юанямі патроіўся і дасягнуў 120 млрд долараў за дзень у 2013 годзе.

ВА УКРАІНЕ МОГУЦЬ УВЕСЦІ ПАДАТАК НА АБМЕН ВАЛЮТЫ



Нацыянальны банк Украіны не выключае ўвядзення ў краіне падатку на абмен валюты ўжо ў 2013 годзе. Пра гэта на брыфінгу заявіў дырэктар юрыдычнага дэпартамента НБУ Віктар Новікаў. Адпаведны законапраект зараз дапрацоўваецца. Калі закон уступіць у сілу, грамадзяне Украіны пры абмене валюты павінны будуць плаціць 10% ад сумы абмену ў выглядзе адлічэнняў у пенсійны фонд.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАМП'ЮТАРНЫЯ ГУЛЬНІ ПАЛЯПШАЮЦЬ ПАМЯЦЬ І ЎВАГУ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

Навукоўцы даведаліся, які эфект відэагульні накшталт гонак маюць на асоб 60—85 гадоў. Як аказалася, гонкі пазітыўна адбіваліся на працоўнай памяці і ўвазе пажылых людзей, піша The Telegraph. Пэўныя моманты гульні развівалі шматзадачнасць — здольнасць, якая слабее з узростам. Праз 12 гадзін гульні пажылыя людзі ўжо маглі абыграць групу 20-гадовых гейміраў, якія раней не сутыкаліся з гэтай гульнёй. А вось паляпшэнні ў памяці і ўвазе заставаліся нават праз 6 месяцаў пасля заканчэння эксперымента. Як адзначалі яго арганізатары, гульні здольныя палепшыць стан не толькі пры страце памяці, але і пры дэпрэсіі, дэменцыі, сіндроме дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці.

РАЗМЯШЧЭННЕ БелАЭС АДПАВЯДАЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПРАКТЫЦЫ

Міжнародныя дакументы не рэгламентуюць адлегласць ад АЭС да буйных населеных пунктаў. У шэрагу краін Еўропы атамныя станцыі пабудаваны паблізу густанаселеных тэрыторый.

■ Грошы

«ПЛАСТЫКАВЫ» КРЭДЫТ

Тое, што безнаяўныя разлікі — гэта зручна, напэўна, многія ўжо зразумелі. Зарплаты ўсім налічваюць на пластыкавыя карткі, і карыстацца імі за некалькі гадоў мы навучыліся. Аплачваем камунальныя плацяжы, кладзём грошы «на мабільнікі», разлічваемся ў крамах і гэтак далей. Аднак добра, калі на картцы ёсць грошы. Часам жа бывае, што грошай не хапае, напрыклад, на нешта, вельмі патрэбнае менавіта цяпер. Што рабіць? У сяброў пастаянна пазычаць надакучыла. Ісці па крэдыт у банк — па-першае, доўга, а па-другое, нявыгадна — давядзецца пераплачваць… Ёсць даўно вынайдзены шлях — крэдытная картка.

Гэта не тое самае, што звычайны крэдыт

МТБанк, які ўжо некалькі гадоў выпускае рознага кшталту крэдыткі, вырашыў распавесці спажыўцам пра тое, што яны сабою ўяўляюць, якія перавагі маюць і як імі карыстацца. І нават з панядзелка запускае новы сайт для папулярызацыі крэдытных картак.

«Крэдытная картка — гэта банкаўская пластыкавая картка, на якой кліенту вызначаецца крэдытны ліміт (ліміт грашовых сродкаў), які можна выкарыстаць,— тлумачыць **Ігар БЫЧАК, намеснік старшыні праўлення ЗАТ «МТБанк».**— Ёсць паняцце «крэдыт на картку». Чалавек хоча 10 мільёнаў. Яму кладуць на картку гэтыя грошы. З гэтага моманту на ўсе 10 мільёнаў налічваюцца працэнты, нават калі ён гэтымі грашыма не карыстаецца. Гэта звычайны спажывецкі крэдыт, які проста залічылі чалавеку на картку. Крэдытная картка — гэта, умоўна, той жа крэдыт на 10 мільёнаў (ліміт), але вы не плаціце працэнтаў да таго моманту, пакуль не пачынаеце гэтай карткай расплачвацца ці здымаць гатоўку. Пры гэтым, калі вы выдаткуеце толькі мільён, то працэнты будуць налічвацца за мільённы крэдыт, а 9 мільёнаў застануцца ў вашым распараджэнні. У гэтым і сэнс крэдытных картак». Аднак крэдытка мае і другую адметную асаблівасць — грэйс-перыяд. Так называюць ільготны перыяд крэдытавання, ці беспрацэнтны перыяд. «Ён, як правіла, вызначаецца ў днях, цягам якіх кліент карыстаецца ўзятымі грашыма (напрыклад, вы знялі мільён рублёў ці купілі штосьці ў краме на гэту суму) бясплатна. Калі цягам гэтага тэрміну кліент цалкам вяртае грошы, то ён не плаціць нічога — ні працэнтаў, ні камісій». Звычайна грэйс-перыяд працягваецца 30 ці 50 дзён. Выдатны варыянт для таго, каб «перабіцца» да зарплаты.

На чым зарабляюць банкі?

«Банкі атрымліваюць камісіі за транзакцыі, якія робяць кліенты. Таму прыбытак атрымліваецца не ад кліента, а ад сістэмы. Нават калі вы кожны раз будзеце своечасова вяртаць грошы, мы будзем зарабляць на гэтым»,— кажа Ігар Бычак. У выпадку непагашэння запазычанасці ў ільготны перыяд яна ператвараецца ў звычайны спажывецкі крэдыт. Між іншым, вельмі карысныя кабрэндзінгавыя карткі, калі крэдытная картка дае дадатковыя бонусы, напрыклад, у пэўнай сетцы крамаў. «Плюс таксама і ў тым, што не трэба ў кожным асобным выпадку афармляць крэдыт. Ды і транзакцыі могуць праходзіць у любой валюце — ідзе аўтаматычная канверсія. Можна браць іх з сабою на адпачынак». Дарэчы, нават тыя, у каго шмат грошай, выкарыстоўваюць крэдытныя карткі, бо гэта выгадна: «У ЗША ў сярэднім 4,2 крэдыткі на душу насельніцтва, у Заходняй Еўропе — 1,5—2. Напрыклад, у Польшчы ў 2005 годзе было 300 тысяч крэдытных картак, у 2011-м — ужо 7 мільёнаў. Па выніках 2012 года расійскі рынак крэдытных картак вырас амаль на 83%. На жаль, па Беларусі такіх лічбаў няма».

Звычайных крэдытаў не будзе

«Я ўпэўнены, што крэдытныя карткі выцесняць звычайнае крэдытаванне»,— лічыць прадстаўнік МТБанка. Між іншым, па яго словах, рынак спажывецкага крэдытавання ніколі ў нас актыўна не рос. Галоўная прычына — высокія працэнтныя стаўкі. Апошнія месяцы сітуацыя змянілася: «У тым ліку за кошт актыўнага ўступлення на гэты рынак новых буйных гульцоў».

Больш жорсткі адбор

Дзіўна, але пратэрмінаваныя запазычанасці па крэдытах банкіраў не пужаюць. «Хоць яны і выраслі, але ў нашай краіне гэты ўзровень застаецца дагэтуль вельмі нізкім. У пратэрміноўцы больш за ўсё вінаватыя махляры, якія набіраюць па несапраўдных дакументах крэдыты. У любым выпадку, мы збіраемся зрабіць больш жорсткія ўмовы для атрымання крэдыту. Будзем глядзець у першую чаргу на ўзровень даходаў чалавека. Мы і цяпер адмаўляем 35% заяўнікаў».

Стаўкі па дэпазітах вырастуць?

Ігар Бычак асвятліў і некалькі набалелых пытанняў. Нацыянальны банк падняў стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі бягучай ліквіднасці банкаў да 45% гадавых. Як гэта паўплывае на дэпазітыня стаўкі? «Я думаю, што калі гэта не часовае нейкае дзеянне, звязанае з недахопам ліквіднасці, а сістэмнае, то цалкам верагодна, што можа павысіцца і агульны ўзровень працэнтных ставак у цэлым па рублях на рынку. Адпаведна — і стаўкі па дэпазітах. Можа быць, гэта было б і карэктна — падняць дэпазітныя стаўкі да 40%. Але я і не скажу, што 35% — гэта мала. Можа быць, Нацбанк хоча яшчэ больш павысіць прывабнасць рублёвых укладаў. Увосень заўсёды стаўкі раслі, а потым плаўна зніжаліся»,— адказаў прадстаўнік МТБанка.

Бяспечныя карткі

«Цяпер людзі ўжо ведаюць: калі з'ездзіў у Тайланд, Турцыю — прыедзь і памяняй картку, перавыпусці яе. Паводле нашай статыстыкі, амаль кожны другі пасля вяртання адтуль мае праблемы з карткай». Аднак, па словах Ігара Бычака, цяпер ужо пачынаюць выпускаць карткі не з магнітнай стужкай, а з чыпамі. Гэта будзе больш бяспечна.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ДАРЭЧЫ

Першая крэдытная картка была выпушчана ў ЗША ў 1950 годзе. Яна была папяровай, і карыстацца ёю можна было толькі ў рэстаранах. Паўнавартасная пластыкавая крэдытная картка была выпушчана ў 1958 годзе.

РУБЛЁВЫЯ ДЭПАЗІТЫ ЗА ПАЎГОДА СКАРАЦІЛІСЯ

Укłады фізічных асоб у нацыянальнай валюце скараціліся да 32,2 трлн рублёў, а ў замежнай валюце павялічыліся да 6,9 млрд долараў. Гэта звесткі на 1 жніўня 2013 года, прыведзеныя ў аналітычным аглядзе Нацыянальнага банка.

УКЛАДЫ «АЗАМЕЖВАЮЦЦА»

Доля ўкладаў у замежнай валюце ў агульнай колькасці дэпазітаў на 1 жніўня склала 65,5% супраць 62% на 1 ліпеня бягучага года (на 1 жніўня 2012 г.— 67,1%). Валютныя ўклады насельніцтва за сем месяцаў павялічыліся на 0,6 млрд долараў (у студзені — ліпені 2012 года — на 1,1 млрд), або на 9,5% (у студзені — ліпені мінулага года — на 26,3%). У ліпені 2013-га дэпазіты ў замежнай валюце раслі ў параўнанні з чэрвенем гэтага года: пераводныя — на 5%, тэрміновыя — на 4,4%.

У той жа час прырост укладаў насельніцтва ў нацыянальнай валюце за студзень — ліпень сёлета склаў 7,9 трлн (у студзені — ліпені 2012-га — Br7,7 трлн). У рэальным выражэнні яны павялічыліся на 22,7% (годам раней — на 38,9%).

У ліпені скарачаліся рублёвыя тэрміновыя дэпазіты — на 7%. Значнае скарачэнне ў параўнанні з папярэднім месяцам адбылося і па пераводных рублёвых укладах насельніцтва — на 13,4%, што можа быць абумоўлена часткова пераводам рублёвых укладаў у валютныя з-за захавання дынамікі паслаблення беларускага рубля, а часткова выкарыстаннем назапашаных сродкаў на карткавых рахунках насельніцтва на адпачынак.

Агулам дэпазіты насельніцтва (у нацыянальнай і замежнай валюце) у банках Беларусі на 1 жніўня 2013 года склалі 93,2 трлн рублёў. Павелічэнне за студзень — ліпень у намінальным выражэнні — 19,4%, у рэальным — 10,5%. Годам раней за гэты перыяд назіраўся намінальны рост дэпазітаў на 33,5%, а ў рэальным выражэнні — на 19,2%.

ВАЛЮТЫ КУПЛЯЮЦЬ МЕНШ

Насельніцтва Беларусі ў жніўні набыло валюты амаль у паўтара раза менш, чым у ліпені,— $903,3 млн супраць $1 млрд 306,9 млн, сведчыць статыстыка Нацыянальнага банка. Фізічныя асобы за жнівень прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на $735,6 млн (за ліпень — $685,4 млн, за чэрвень — $619,1 млн) у эквіваленце, набылі — $903,3 млн (за ліпень — $1 млрд 306,9 млн, за чэрвень — $884,2 млн). Такім чынам, чыстая купля замежнай валюты склала $167,7 млн, што ў 3,7 раза менш, чым у ліпені ($621,5 млн). Варта адзначыць, што да чэрвеня, пачынаючы з лютага, фізічныя асобы прадавалі валюты больш, чым куплялі. Змяненне тэндэнцыі летам эксперты тлумачылі ў тым ліку сезонам адпачынкаў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Курсавая розніца

ПАДАЕ ЛІСЦЕ

А разам з ім і беларускі рубель. Долар «выскачыў» на гэтым тыдні за псіхалагічную для многіх мяжу ў 9000 рублёў. Але еўра і «расіянін» не пабеглі за калегам.

Еўра і на сусветным валютным рынку здаў пазіцыі з-за сірыйскага канфлікту і недастатковай упэўненасці Еўрапейскага Цэнтрабанка ў сваёй далейшай палітыцы. У Беларусі ён знізіўся на 40 рублёў (мінус 0,3%) да 11860. Туды ж пайшоў і расійскі рубель — патаннеў на 1 грашовую адзінку (мінус 0,4%) да 270,5.

Аднак самая цікавая сітуацыя з доларам. За тыдзень ён падняўся на 50 рублёў (плюс 0,6%) да 9040. Чэргаў у абменнікаў не з'явілася, але людзі занепакоіліся. Тым больш што статыстыка Нацбанка зноў гаворыць аб перавазе куплі валюты над продажам. Таксама не на карысць беларускага рубля і новыя звесткі аб золатавалютных рэзервах. Як паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка, па выніках жніўня золатавалютныя рэзервы Беларусі у вызначэнні Спецыяльнага стандарту распаўсюджвання звестак МВФ скараціліся на 214,9 млн долараў ЗША і, папярэдне, на 1 верасня 2013 года склалі 7,712 млрд долараў у эквіваленце. У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў скарацiўся на 135 млн долараў і на 1 верасня склаў 8,4304 млрд. «На зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў паўплывала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме»,— тлумачаць у Нацбанку.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

ЗА СПЕЦЫФІКУ РАБОТЫ ПЕДАГОГАМ БУДУЦЬ ДАПЛАЧВАЦЬ

Эксперымент па апрабацыі новай галіновай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў стартуе ў пяці мінскіх школах.

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў прэс-службе галоўнага адукацыйнага ведамства, галіновая аплата працы педагагічных работнікаў мае на ўвазе, акрамя выплаты педагогам акладу (стаўкі), таксама і дадатковыя выплаты, якія адлюстроўваюць спецыфіку работы педагогаў і выкананне імі функцый, абумоўленых кваліфікацыйнымі характарыстыкамі.

Мяркуецца, што заработная плата педагагічных работнікаў, якія стануць удзельнікамі эксперыменту, павялічыцца ў сярэднім на 15%. Пры гэтым фінансаванне выдаткаў на аплату працы педагагічных работнікаў гэтых устаноў будзе ажыццяўляцца ў межах сродкаў, прадугледжаных у мясцовым бюджэце.

Разам з тым, заработная плата без уліку прэмій і надбавак стымулюючага характару пры ўвядзенні новай сістэмы аплаты працы (пры ўмове захавання ранейшага аб'ёму нагрузкі на педагога і выканання ім работ той жа кваліфікацыі) не можа быць ніжэйшая за ранейшую. Гэта мера санатавана ў пастанове Савета Міністраў ад 30 жніўня № 776 «Аб правядзенні эксперыменту па апрабацыі галіновай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў».

Вынікі правядзення эксперыменту павінны быць прадстаўлены ва ўрад да 1 верасня 2014 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПЕРАПРАЦОЎКА ІДЗЕ ШПАРКА

Перапрацоўчыя арганізацыі спажывецкай кааперацыі па меры выспявання кабачкоў, цыбулі, капусты, бруснiц распачынаюць «засваенне» гэтай плодаагароднінай сыравіны.

Усяго ўжо, згодна з аператыўнай інфармацыяй Белкаапсаюза, перапрацавана 13,6 тысячы тон сельскагаспадарчай і дзікарослай сыравіны. У тым ліку агародніны — 2,1 тысячы тон (з тэмпам росту 118 працэнтаў), з іх агуркоў 1,2 тысячы тон (тэмп росту да адпаведнага леташняга перыяду 114 працэнтаў). Агуркоў метадам салення перапрацавана 0,9 тысячы тон (тэмп росту 116 працэнтаў), кансервавымі прадпрыемствамі — 0,3 тысячы тон, што ў 1,6 раза больш, чым летась. Вядзецца перапрацоўка яблыкаў: яе аб'ёмы павялічаны на 16 працэнтаў да аналагічнага леташняга перыяду. Аб'ёмы перапрацоўкі памідораў вышэйшыя за мінулагоднія на тую ж дату ў 2,3 раза.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАЙБОЛЬШ ГРОШАЙ ПРАПАНУЮЦЬ КІРАЎНІКАМ І IT-СПЕЦЫЯЛІСТАМ

Гэта вынікае з аналізу 13000 жнівеньскіх вакансій, які правёў HeadHunter Беларусь, праект RABOTA.TUT.BY.

Напрыклад, самы высокі заробак прапануюць дырэктару па транспартнай і складской лагістыцы ў буйной рознічнай сетцы (да 6000 долараў) ці матэматыку-аналітыку ў IT-кампаніі (ад 5000 долараў). «Закрывае» дзясятку найбольш прывабных заробкаў галоўны інжынер у транспартнай кампаніі (ад 3000 долараў). А менеджар па продажах камп'ютарнай тэхнікі будзе мець да 5000 еўра. «Характэрна, што менеджар па продажах мае магчымасць зарабляць больш, чым кіраўнік дэпартамента ў буйной кампаніі. Аднак варта адзначыць, што заробак менеджара па продажах складаецца з акладу і працэнта ад продажаў, таму можа вагацца ў розныя месяцы. У гэты рэйтынг увайшлі толькі мінскія вакансіі. Спадзяёмся, што восень парадуе высокааплатнымі прапановамі аб працы і ў рэгіёнах»,— адзначае Святлана Шапарава, дырэктар HeadHunter Беларусь, праект RABOTA.TUT.BY.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

МАТЭМАТЫКА ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ — ДЫСТАНЦЫЙНА

Механіка-матэматычны факультэт БДУ распрацаваў для старшакласнікаў новую інтэрактыўную праграму, скіраваную на паляпшэнне ведаў па матэматыцы і эфектыўную здачу ЦТ па гэтым прадмеце. Даступная яна будзе ў рамках работы Школы юных матэматыкаў.

Фактычна размова ідзе пра дыстанцыйнае навучанне матэматыцы, якое забяспечвае доступ да літаратуры, тэарэтычнага матэрыялу, задач і метадаў іх рашэння, а таксама гарантуе кантроль і дыягностыку ў рэжыме анлайн. Гэтая форма навучання можа быць асабліва карыснай школьнікам з аддаленых рэгіёнаў нашай краіны, якія змогуць на працягу года прайсці даўніверсітэцкую падрыхтоўку па матэматыцы. А кантраляваць самастойную работу старшакласнікаў, каментаваць і тлумачыць ім задачы будуць выкладчыкі механіка-матэматычнага факультэта.

Дарэчы, да распрацоўкі інтэрактыўнага курса прыклалі сваю руку як выкладчыкі БДУ, так і педагогі Ліцэя БДУ, школ і гімназій. Таксама ва ўніверсітэце ўжо вядуцца работы па распрацоўцы інтэрактыўных праграм для школьнікаў 5—9-х класаў. Іх таксама плануецца запусціць у бліжэйшы час.

Рэгістрацыя ахвотных прайсці дыстанцыйны курс навучання матэматыцы распачнецца 9 верасня. Запоўніць анкету можна па адрасе www.dl.bsu.by.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СРОДКІ ІНАВАЦЫЙНАГА ФОНДУ ЗАКАТАЛІ Ў АСФАЛЬТ

Сродкі інавацыйнага фонду Гродзенскага аблвыканкама ў суме 200 мільёнаў рублёў замест фінансавання ўкаранення энергаэфектыўных тэхналогій і абсталявання, асваення новых відаў навукаёмістай прадукцыі, рэалізацыі інавацыйных праектаў у Дзятлаўскім РУП ЖКГ зрасходаваны на асфальтаванне дваровай тэрыторыі кацельні ў пасёлку Наваельня.

Акрамя таго, устаноўлены факт пералічэння бюджэтных сродкаў у суме 389,5 мільёна рублёў падрадчыку за нявыкананыя работы па рэканструкцыі кацельні ў пасёлку Гезгалы з пераводам на мясцовыя віды паліва, а таксама выяўлена завышэнне аб'ёмаў і кошту работ на 18,2 мільёна рублёў. Матэрыялы праверкі для прававой ацэнкі накіраваны ў праваахоўныя органы, паведамляе Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

■ Белая вежа-2013

ФЕСТЫВАЛЬ БЕЗ ЖУРЫ

Узнагароды прысудзяць арганізатары, гледачы і журналісты

Васямнаццатая «Белая вежа» пройдзе ў Брэсце з 7 па 14 верасня. На фэст прыедуць 23 тэатральныя калектывы. Мы ўбачым 24 спектаклі на васьмі мовах свету. Калектывы з Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Грэцыі, Егіпта, Ізраіля, Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны, Чэхіі, Швецыі, Японіі будуць працаваць на пяці сцэнічных пляцоўках: дзве залы тэатра, грамадска-культурны цэнтр, парк і плошча Леніна. Білеты былі фактычна прададзены яшчэ за два тыдні. А на самыя папулярныя тэатры квіток каштуе 200 тысяч рублёў, што для Брэста, відавочна, нямала.

Як расказаў на прэс-канферэнцыі галоўны арганізатар фестывалю, дырэктар Брэсцкага драматычнага тэатра Аляксандр Козак, усяго ў аргкамітэт паступіла 210 заявак ад розных тэатраў свету. Экспертны савет сфарміраваў рэпертуар, у якім выдзяляюцца тры асноўныя кірункі: міжнародная тэатральная праграма, лепшыя спектаклі беларускага тэатра, польскі тэатр на «Белай вежы».

А вось журы ў гэтым годзе на тэатральным форуме не будзе. Паводле слоў Аляксандра Козака, так праходзяць 90% фестываляў у свеце. І ў Брэсце інстытут журы апошнім часам крыху расчараваў арганізатараў. Па-першае, члены журы могуць дамовіцца, а па-другое, вельмі часта ўсё вырашае меркаванне аднаго чалавека — старшыні журы. Але гэта не значыць, што ацэньваць спектаклі ніхто не будзе. У Брэст едзе цэлая кагорта вядомых крытыкаў. Такіх, як Людміла Грамыка, Ірына Плотнікава, Ніна Мазур, а таксама і найшаноўнейшая прафессар Тацяна Арлова.

Лепшы спектакль вызначыць аргкамітэт. На яго пасяджэнне запросяць таксама спецыялістаў і журналістаў. Крытыкі вызначаць выканаўцаў лепшай мужчынскай і жаночай роляў. Акрэдытаваныя журналісты назавуць лепшы тэатральны эксперымент. Таксама прадугледжаны дыплом за выбар гледачоў. Кожны чалавек пасля спектакля зможа «аддаць» свой голас, калі пры выхадзе кіне білет у спецыяльную скрынку. Потым білеты падлічаць, выведуць працэнтныя суадносіны — бо нельга ж параўноўваць глядацкія сімпатыі да спектакляў, якія праходзілі ў малой і вялікай зале, і вылучаць спектакль, які сабраў арыфметычную большасць галасоў публікі. Такі варыянт ацэнкі арганізатары палічылі больш дэмакратычным у параўнанні з банальным журы. Што ж, пажывём-пабачым.

Як пабачым і тэатральныя пастаноўкі, якія хочацца верыць, не расчаруюць. Афіша абяцае нямала цікавых работ.

Напрыклад, вельмі інтрыгуе анонс тэатра-фестывалю «Балтыйскі дом» з Санкт-Пецярбурга. Яны вязуць спектакль «Антыцелы» пра забойства студэнта-антыфашыста Цімура Качаравы. На сцэне будуць сябры-аднакурснікі і ворагі Цімура — прадстаўнікі фашысцкіх груповак. Усё гэта падзеі сённяшняга жыцця. Але яшчэ страшнейшая трагедыя маці хлопцаў, дзвюх жанчын, настаўніцы замежнай мовы і выпускніцы кансерваторыі, якія гадавалі сыноў для шчасця, а не для смерці і забойства.

Трагедыя сучаснай рэчаіснасці прысутнічае і ў спектаклі Акадэмічнага нацыянальнага тэатра драмы з Азербайджана «Пакаянне». Карабахская вайна стала момантам ісціны для двух сяброў. Адзін з іх застаўся са сваімі перакананнямі і жыве ў беднасці, другі зарабіў грошай на гэтых ваенных дзеяннях і мае пра вайну сваё меркаванне. Гледачоў таксама чакае сустрэча з армянскім акцёрам Робертам Акапянам. Некалькі гадоў таму ён прывозіў у Брэст монаспектакль «Амок». А цяпер выканае ролю злодзея ў камедыі «Старадаўнейшая прафесія».

Відаць, сябрам фестывалю ўжо можна назваць Львоўскі тэатр «Уваскрэсенне». Ён бываў у нас не раз. У 2007 годзе узяў Гран-пры за вулічны спектакль «Вішнёвы сад». Здараліся і слабейшыя пастаноўкі. А сёлета нам пакажуць таксама спектакль на вуліцы па п'есе Караля Вайтылы, вядомага як Папа Рымскі Ян Павел II. Дзея называецца «Іоў». Яшчэ адзін вулічны спектакль сыграе тэатр з Познані. «Сальта Мартале», гаворыцца ў анатацыі, спектакль для шасці фартэп'яна і дванаццаці акцёраў. Гэта шчымлівая гісторыя пра знішчэнне культурных каштоўнасцяў падчас Другой сусветнай вайны.

Нашу краіну на фестывалі прадстаўляе, напрыклад, спектакль «Пікавая дама» Гродзенскага абласнога тэатра лялек. Гэтая пастаноўка атрымала перамогу адразу ў чатырох намінацыях II Нацыянальнай тэатральнай прэміі і стала «Лепшым спектаклем года». Псіхалагічную драму «Аднакласнікі» вязе Магілёўскі абласны драматычны тэатр. І гэта тытулаваны спектакль. Работа тэатра-студыі кінаакцёра з Мінска «Хто смяецца апошнім» па вядомай п'есе К. Крапівы атрымала ганаровае права адкрыць «Вежу-2013».

Тэатралаў зацікавяць і грэчаскія «Сны», бо іх паставіў Альгірдас Латэнас, і «Гамлет. Кропка G», бо яе вязе «Тэатр Месяца» з Масквы, і спектакль рытму, пластыкі і танца «Палароід» з Тэль-Авіва.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
30 сентября 2013 г. проводит повторный открытый аукцион № 09-Сф-13 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляются 13 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске:

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Ангарская, 213 А (Заводской район)	500000000002008103	0,0564	442 985 400	45 000 000	6 530 359
2.	ул. Фучика, 7 (Заводской район)	500000000002007565	0,0574	453 454 720	45 000 000	2 134 249
3.	пер. Грибной, 46/19 (Заводской район)	500000000002008105	0,0477	374 645 700	38 000 000	6 791 106
4.	проезд Енисейский, 7 (Заводской район)	500000000002008102	0,0478	375 460 800	38 000 000	5 761 190
5.	ул. Чекалина, 49 (Заводской район)	500000000002008104	0,0440	345 602 400	35 000 000	6 100 140
6.	земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005469	0,0754	883 064 750	90 000 000	2 168 213
7.	земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005076	0,0736	861 990 290	87 000 000	1 864 388
8.	земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005482	0,0733	858 469 250	86 000 000	2 168 213
9.	земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005372	0,0700	819 824 110	82 000 000	1 864 388
10.	земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005371	0,0638	747 211 290	75 000 000	1 864 388
11.	пер. 1-й Артема, 17 (Заводской район)	500000000002007983	0,0590	471 860 520	50 000 000	4 927 614
12.	ул. Таежная, 45 (Партизанский район)	500000000001033858	0,0512	417 290 750	42 000 000	5 148 923
13.	пер. 1-й Зубачева, 12 (Октябрьский район)	500000000004004874	0,0511	492 811 260	50 000 000	4 927 614

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Земельные участки, расположенные в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 находятся в водоохранной зоне водных объектов г.Минска, имеют пониженный рельеф местности, высокий уровень залегания грунтовых вод, представлены торфяными почвами. Инженерно-геологические условия территории ограниченно благоприятные для строительства на естественном основании. Осложняющими факторами являются условия поверхностного стока, во влажные периоды года возможно застаивание атмосферных и талых вод в понижениях микрорельефа.

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 30 сентября 2013 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) **не позднее 24 сентября 2013 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 13 сентября 2013 г. по 24 сентября 2013 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора торгов www.mgcn.by.

Віншую нашага кіраўніка **Сцяпана Пятровіча ХАЛЬКО** з днём нараджэння. Радуемся разам з вамі тым вялікім пераменам, якія адбыліся ў Моладаве пад вашым кіраўніцтвам. Жадаем неабдымнага шчасця вам, моцнага здароўя і новых працоўных перамог.
Калектыў прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Моладава-Агра» Іванаўскага раёна.
УНП 290237283.

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 18 (26)

■ Ваенны летапісец

ТАНКАВЫ КОРПУС № 2

Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму Мар'іна Горка славілася самым вялікім ваенным гарнізонам у Беларусі. З 11 воінскіх фарміраванняў, што размяшчаліся тут, сёння існуе толькі адно — 5-я асобная брыгада спецыяльнага прызначэння. Месца, дзе знаходзіцца элітнае падраздзяленне Узброеных Сіл, нагадвае некаторым мясцовым жыхарам яшчэ пра адну ўнікальную часць, якой ужо няма, — 8-ю гвардзейскую танкавую дывізію.

ВАЕННАЯ БІЯГРАФІЯ ЗЛУЧЭННЯ

Сфарміраваны 2-і танкавы корпус (так першапачаткова называлася злучэнне) быў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта тады, пасля перамогі савецкіх войск у бітве за Маскву, узнікла неабходнасць стварыць чатыры новыя буйныя танкавыя аб'яднанні. Адно з іх з'явілася ў горадзе Горкім (зараз Ніжні Ноўгарад) у красавіку 1942 года. Першым камандзірам 2-га танкавага корпуса быў назначаны гамяльчанін, Герой Савецкага Саюза, генерал-маёр Аляксандр Лізюкоў.

Беручы ўдзел у буйнейшых аперацыях Вялікай Айчыннай, танкісты крок за крокам вызвалялі Радзіму. Пасля баёў пад Сталінградам ад корпуса, па ўспамінах ветэранаў, засталася толькі назва і невялікая група афіцэраў. На доўгі час аб'яднанне было выведзена ў рэзерв на перафарміраванне, пасля чаго з верасня 1943 года пачало называцца 8-м гвардзейскім танкавым корпусам.

Пасля вайны, восенню 1945 года, корпус увайшоў у склад Беларускай ваеннай акругі і быў перайменаваны ў 8-ю гвардзейскую танкавую Чырванасцяжную дывізію. У 1947 годзе яе месцам дыслакацыі стала Мар'іна Горка. У склад дывізіі ўвайшло 7 палкоў, 4 батальёны і асобны ракетны дывізіён.

СЛУЖЫЦЬ ТУТ МАРЫЛІ ТАНКІСТЫ...

У хуткім часе праслаўленае злучэнне стала сапраўднай кузняй ваенных кадраў. Тут праходзілі службу і атрымлівалі вопыт кіравання войскамі многія военачальнікі Савецкага Саюза і незалежнай Беларусі. У тым ліку і сённяшні міністр абароны генерал-лейтэнант Юрый Жадобін.

Тут марылі працягваць службу і тыя, хто ўжо ў свой час развітаўся з арміяй. Так было з ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Васілём Цыкрам, які прыехаў у Мар'іну Горку па рэкамендацыі роднага брата, што служыў начальнікам сувязі ў першым батальёне 94-га палка. І гэта пасля франтавой загартоўкі, якую ён атрымаў, будучы ў складзе пяхотнага палка ў Іванаўскай вобласці, танкавага палка ва Уладзіміры і самаходнага артылерыйскага палка ў Растове, дзе з'яўляўся камандзірам разліку.

Усюды 18-гадовы юнак быў па тры месяцы. І ўсё за апошні год вайны! За вызваленне венгерскага горада Папа быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. А пасля вызвалення Вены застаўся сумны напамін: тут падчас баёў Васіль Цыкра разам з усімі членамі экіпажа гарэў у самаходцы. Пасля два з паловай месяцы праляжаў у шпіталі, залечваючы абгарэлыя рукі і твар. Тут сустрэў і Дзень Перамогі.

— Хто не бачыў, нават уявіць сабе не можа, колькі ў нас тады было радасці! — успамінае Васіль Андрэевіч. — Усе палілі са стрэльбаў: хто ў вокны, хто ў неба. Так адзначалі Перамогу!

Далейшую службу Васіль Цыкра працягваў у Малдавіі. Тут, у зенітным палку, служыў у аркестры. Іграў на альце, барытоне, трубе. Армія з яго зрабіла музыканта. Пасля дэмабілізацыі на радзіме — у пасёлку Смотрыч, што ў Хмяльніцкай вобласці ва Украіне, — працаваў у Доме культуры. Адсюль разам з сям'ёй прыехаў у 8-ю танкавую дывізію, дзе ўладкаваўся ў аркестр 94-га гвардзейскага палка. Пасля іграў у дывізіённым аркестры, стаў старшынёй роты кіравання ў штабе дывізіі. У 1973 годзе звольніўся ў запас і тут, у Мар'інай Горцы, якая за гэты час паспела стаць для яго другой радзімай, асеў назаўсёды.

І не ён адзін. Ці то гэты куточак беларускай зямлі палюбіўся Аляксандру Вароўскаму, ці то яго прывабіла прафесія танкіста, афіцэр запасу не прызнаецца. Напэўна, і першае, і другое. Ці як патлумачыць тое, што ён, адслужыўшы тут, паехаў дахаты ў Сібір і праз год вярнуўся?

— 8-я гвардзейская танкавая дывізія стала для мяне другім домам, — расказвае Аляксандр Кірылавіч. — Калі пасля дэмабілізацыі паехаў на радзіму, вельмі засумаваў па калектыве, па танках... Напісаў ліст у полк, у якім прасіў забяспечыць мяне працоўным месцам. Атрымаў станоўчы адказ. Пачаў збіраць чамаданы: быў упэўнены, што еду ні на год і ні на два. Ажаніўся з дзяўчынай, з якой вёў перапіску. Прыехаў сюды ўжо з жонкай і сынам.

І працягваў службу ў гэтым палку да звальнення ў запас. 27 гадоў жыцця прысвяціў ваеннай прафесіі і танкам! Быў наводчыкам, механікам-вадзіцелем, намеснікам камандзіра роты па ўзбраенні.

Былыя танкісты каля помніка дывізіі, дзе некалі служылі.

ТАНКАВАЕ МАЙСТЭРСТВА ПА-АРАБСКУ І ВУЧЭННІ, ЯК НА ВАЙНЕ

У пасляваенны час у дывізіі пачалася планавая баявая вучоба. У арганізацыі навучальнага працэсу даводзілася пераадольваць нямала сур'ёзных цяжкасцяў: адсутнічала матэрыяльная база, адчуваўся недахоп вучэбнай літаратуры, у казармах было няўтульна. Нярэдка вайсковая падрыхтоўка спалучалася з гаспадарчымі работамі і іншымі неадкладнымі задачамі.

Даводзілася дзяліцца вопытам і з замежнымі калегамі. Гэтую важную місію даручылі вопытнаму танкісту Вароўскаму. Інтэрнацыянальны доўг выконваў у Балгарыі, Судане і Лівіі. Па некалькі гадоў ён, інструктар па ваджэнні танкаў Т-72, выкладаў замежным афіцэрам танкавае майстэрства.

— Заняткі вёў на арабскай мове, якую прыйшлося вывучыць. Часам размаўляў па-англійску і па-ўкраінску, — успамінае танкіст. — Палігонаў там не было, таму навыкі адпрацоўвалі ў пустыні. І трэба сказаць, што, нягледзячы на такія ўмовы, нашы танкі вялі сябе цудоўна!

У той час на ўзбраенні дывізіі знаходзіліся танкі Т-34 і Т-76, М4А2 «Шэрман», ІС-2, самаходна-артылерыйскія ўстаноўкі СУ-85, СУ-76, СУ-57, бронетранспарцёры і бронемашыны БТР МЗА1, «Скаут», БА-64. Як лічыць былы танкіст Міхаіл Іваноў, які прайшоў шлях ад наводчыка танка да яго камандзіра і якога ваеннае жыццё насіла амаль па ўсіх танкавых палках СССР, іх нельга параўнаць з цяперашняй тэхнікай.

— Сучасным танкам кіраваць намнога лягчэй, — перакананы былы камандзір танкавага батальёна. — Раней экіпаж танка складаўся з пяці чалавек, а сёння ўсе задачы здольныя выканаць тры спецыялісты. Ужо няма ў танку зараджальшчыка і стралка-радыста. Іх функцыі выконвае тэхніка. Зараз танкавы экіпаж — камандзір танка, наводчык-аператар і механік-вадзіцель. Праўда, як раней, так і цяпер, не вывучыўшы тэорыю, кіраваць танкам немагчыма. Калі гляджу парад, так хочацца ізноў пракаціцца на Т-34, уключыць стабілізатар, даць выстрал!

Як успамінаюць ветэраны, у першыя гады пасля Перамогі, асабліва ў перыяд «халоднай вайны», баявая падрыхтоўка была арганізавана па прынцыпе «Вучыць войскі таму, што неабходна на вайне».

— Вучэнні былі яшчэ якімі! — дадае былы зампаліт батальёна 8-й гвардзейскай танкавай дывізіі Іван Паўлюкавец. — Узводныя, ротныя, батальённыя, палкавыя, дывізіённыя, нават у маштабе Узброеных Сіл.

Міхаіл Іваноў, напрыклад, удзельнічаў у вучэннях краін Варшаўскага дагавора. Прычым вучэнні пачаліся ў Румыніі, а скончыліся ажно ў Германіі.

— Аднойчы да нас у Малдавію прыязджаў сам маршал Жукаў! — успамінае Васіль Цыкра. — На той час ён з'яўляўся камандуючым Адэскай ваеннай акругі. Дык вось з намі ён праводзіў заняткі. У яго былі такія вучэнні, быццам ізноў ішла вайна!

Танкістаў заўсёды бераглі падчас вайны: іх лічылі галоўнай ударнай сілай сухапутных войск. У мірны час гэтая прафесія паступова страчвала актуальнасць. Пра што сведчыць хаця б тое, што ў 1990 годзе 8-я гвардзейская танкавая дывізія была пераўтворана ў 6313-ю гвардзейскую базу захоўвання маёмасці. У 1991-м і яна была расфарміравана.

Так магутнейшая танкавая дывізія перастала існаваць на беларускай зямлі. Прайшло некалькі гадоў — і самы вялікі гарнізон краіны застаўся толькі на старонках кніг і гістарычных дакументаў. Ды ў памяці тых, хто яшчэ некалькі гадоў таму нёс службу ў Пухавіцкім краі.

Вераніка КАНЮТА.
Фота аўтара.

г. Мар'іна Горка

■ Спецыяльныя сустрэчы

Урок мужнасці

У рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі «Дзякуй салдатам Перамогі за тое, што не ведаем вайны» ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылася ўрачыстая сустрэча пад сімвалічнай назвай «Подзвіг вызваліцеляў захоўваем вечна», прысвечаная 70-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Старшыня фонду імя Жукава Дзмітрый СЯНЬКО і чацвёртакласніца Таццяна ПАШКЕВІЧ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Падобныя мерапрыемствы для навучэнцаў сярэдняй школы № 83 імя Жукава г. Мінска — не рэдкасць. Грамадска-патрыятычнае выхаванне — адзін з асноўных кірункаў дзейнасці навучальнай установы. Рэгулярна школьнікаў наведваюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Нямала мерапрыемстваў ім прысвячаюць і юныя патрыёты. Напрыклад, з нагоды дня нараджэння маршала Жукава ў школе плануецца правядзенне адкрытай канферэнцыі «Асоба ў гісторыі: Георгій Канстанцінавіч Жукаў. Яго роля ў пераломных бітвах у перыяд Вялікай Айчыннай вайны». Выкладчыкамі і вучнямі распрацавана электронная гульня «Перамога». У школе актыўна працуе музей баявой славы. Нават арганізуюцца экскурсіі да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайне, чые ўнукі і праўнукі вучацца ў школе.

— Сённяшняя сустрэча — урок мужнасці, — зазначыла **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 83 імя Жукава г. Мінска Святлана КЛЯБАНАВА.** — Зварот да гісторыі, асабліва да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і гісторыі яе герояў, настройвае дзяцей на больш глыбокае разуменне прычынна-выніковых сувязяў мінулых падзей. Я заўсёды ім кажу, што немагчыма, не ведаючы мінулага, рухацца ў будучае.

Вераніка КАНЮТА

■ Вылучыліся!

«ЗОРКІ» ТАНКАВАГА БІЯТЛОНУ

Некаторы час таму падмаскоўны палігон Алабіна з'яўляўся мекай танкавага майстэрства. Лепшыя танкісты з Беларусі, Расіі, Казахстана і Арменіі змагаліся тут за лідэрства ў гэтай ваеннай прафесіі. З першых у свеце міжнародных спаборніцтваў «Танкавы біятлон» беларуская каманда вярнулася з 3-м месцам і... з бронзавым танкам.

Першым стаў танкавы экіпаж з Расіі. Сярэбраны медаль дастаўся танкістам з Казахстана. Чацвёртае месца — у армянскай дружыны.

Два экіпажы прадстаўлялі нашу краіну на спаборніцтвах. У асноўны ўвайшлі танкісты з 355-га гвардзейскага асобнага танкавага батальёна 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады. Ролю запасных выконвалі вайскоўцы з танкавага батальёна 6-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады.

За дзень да спаборніцтваў беларускім танкістам далі магчымасць апрабаваць даручаную тэхніку, праехаць на танку Т-72 па маршруце трасы. Усе машыны толькі прыбылі ў парк 2-й гвардзейскай мотастралковай дывізіі з рамонтнага завода, іх пробег складаў не больш за 150 кіламетраў. Рознакаляровыя танкі былі ў выдатным тэхнічным стане. Пасля лёсавання беларусам дастаўся танк жоўтага колеру.

— Да самага апошняга моманту наша каманда ўпэўнена трымалася на другім месцы, — расказаў **наводчык-аператар танка гвардыі радавы Аляксей КРАСНАПРОШЫН.** — Аднак не абышлося без тэхнічных непаладак: правады тэлекамер заблакіравалі аўтаматычны механізм зараджэння. У выніку экіпаж апынуўся на штрафным крузе. Час быў упушчаны, і наша каманда фінішавала трэцяй. Хоць па колькасці знішчаных мішэняў і беспамылковага пераадолення перашкод, па прызнанні суддзяў, мы былі лепшымі.

Дастаткова хаця б таго, што іх прызналі лепшымі ў Беларусі. Іначай, не гэтая слаўная тройка прадстаўляла б нашу краіну на спаборніцтвах такога ўзроўню.

— Перш чым трапіць на «Танкавы біятлон», членам экіпажа давялося прайсці не менш складанае спаборніцтва — праўда, ужо сярод сваіх, — зазначыў **камандзір 3-й танкавай роты 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады гвардыі старшы лейтэнант Іван ВЫСАКОС.** — Экіпаж быў прызнаны лепшым у батальёне: падчас папярэдніх стрэльбаў ён паказваў добрыя вынікі на трэнажорах і ў палявых умовах, дзейнічаў хутка і зладжана. Самае галоўнае, што члены экіпажа маглі ліквідаваць магчымыя няспраўнасці падчас стральбы.

Толькі такія ўмельцы былі і ў іншых вайсковых часцях. Таму галоўны конкурсны адбор адбыўся на палігоне Абуз-Лясноўскім, што пад Баранавічамі. Тут падчас сур'ёзных выпрабаванняў яны, танкісты са 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады, і паказалі лепшыя вынікі. Адразу і высветлілася, хто паедзе на спаборніцтвы ў Расію. Другімі на палігонных вучэннях сталі гродзенцы. Яны былі прызначаны запаснымі.

На працягу месяца два экіпажы трэніраваліся на Абуз-Лясноўскім. Дзясяткі гадзін, праведзеных тут, не прайшлі дарэмна. Усе перашкоды падчас «Танкавага біятлону» былі пройдзены паспяхова. Манеўравалі «змейкай», зараджалі кіраваную ракету, стралялі, пераадольвалі брод, мінаўзрыўную агароджу, з лёгкасцю ехалі па калейным месце.

Як прызнаюцца члены экіпажа, яны хутка знайшлі агульную мову. У танкістаў па-іншаму і быць не павінна! І гэта нягледзячы на розны ўзрост, жыццёвы лёс, супрацьлеглыя характары.

Аляксей Краснапрошын, наводчык-аператар танка, нарадзіўся ў Мар'інай Горцы. У армію прызваўся адразу пасля заканчэння школы. Тое, што хлопца выбралі для ўдзелу ў спаборніцтвах, стала нечаканасцю для яго і гонарам для бацькоў. У лістападзе юнак дэмабілізоўваецца. Толькі армія, асабліва танкавы біятлон, яму запомніцца надоўга. Хлопец перакананы: спаборніцтвы дадалі яму ўпэўненасці ў сабе, прыбавілі жыццёвага вопыту.

Камандзір беларускага экіпажа, старшы лейтэнант Арцём Багданаў, — камандзір і ў рэальным ваенным жыцці. Ён камандуе танкавым узводам 355-га гвардзейскага асобнага батальёна 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады. Малады чалавек прыехаў у сталіцу з Бабруйска. Скончыўшы агульнавайсковы факультэт Ваеннай акадэміі, ва Уручы вось ужо другі год праходзіць афіцэрскую службу.

Механік-кіроўца ў экіпажы — гвардыі яфрэйтар Ігар Бабіч. У 355-ы гвардзейскі асобны танкавы батальён на час падрыхтоўкі і правядзення спаборніцтваў прыбыў з Заслонава, дзе праходзіць службу па кантракце. Нарадзіўся хлопец у вёсцы Чарневічы Глыбоцкага раёна, што на Віцебшчыне.

Падчас узнагароджання лепшых танкавых экіпажаў з рук міністра абароны Расійскай Федэрацыі генерала арміі Сяргея Шайгу беларускія танкісты асноўнага экіпажа атрымалі медалі «За ўмацаванне баявой садружнасці».

Адным словам, «Танкавы біятлон» не прайшоў безвынікова. Галоўнае ўпраўленне баявой падрыхтоўкі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь нават плануе ўнесці змены ў праграму вучобы танкістаў. Менавіта ў адпаведнасці з тымі нарматывамі, якія праводзіліся падчас «Танкавага біятлону». Палічылі, што падобныя спаборніцтвы — практычна адзін з эпізодаў вядзення рэальных баявых дзеянняў. Хіба толькі адсутнічае агонь з боку праціўніка. А гэтага лепш і не ведаць.

Вераніка КАНЮТА

■ Vivat, курсант!

МЕНШ НАВУКІ, БОЛЬШ ПРАКТЫКІ

Пакуль студэнты грамадзянскіх ВНУ адпачывалі, курсанты Ваеннай акадэміі ўжо ваўсю спасцігалі ваенную навуку. Першакурснікі прайшлі курс агульнавайсковай падрыхтоўкі, паспелі адаптавацца да армейскай дысцыпліны, навучыліся прышываць каўняры і ў выніку атрымалі курсанцкія пагоны.

А сапраўдная класічная навука ў іх пачалася як і ва ўсіх. У другі дзень верасня курсанты зноў селі за парты, першакурснікі ўпершыню адкрылі падручнікі па ваенным майстэрстве. Сярод навічкоў — 313 юнакоў з розных рэгіёнаў Беларусі. Трое з іх будуць навучацца ў Акадэміі МУС. 43 чалавекі выратавалі атрымліваць ваенную адукацыю ў ВНУ Расійскай Федэрацыі.

— Сённяшні курсант — будучы афіцэр, — ахарактарызаваў першакурсніка **начальнік Ваеннай акадэміі генерал-маёр Сяргей БОБРЫКАЎ.** — У асноўным, гэта жыхар горада. На жаль, з кожным годам усё менш абітурыентаў з сельскай мясцовасці. За месяц, які курсанты правялі тут, яны выраўняліся, сталі падобнымі адзін да аднаго. Галоўнае, што іх аб'ядноўвае, — аднолькавыя мэты, дзеля якіх яны прыйшлі вучыцца ў галоўную ваенную ВНУ краіны.

Новаспечаны курсант Аляксандр Бухта будзе спасцігаць ваенную навуку на агульнавайсковым факультэце Ваеннай акадэміі па спецыяльнасці «Мотастралок». Юнак жартуе, што гэта добрая заяўка ў камандзіры: якраз такіх спецыялістаў большасць сярод каманднага складу Узброеных Сіл краіны. І ў яго на выдатную кар'еру ёсць усе шанцы. Аляксандр працягвае ваенную дынастыю сваёй сям'і: дзядуля, бацька, дзядзька і брат у розныя часы прысягалі на вернасць Айчыне. Таму годна праходзіць службу для юнака — задача № 1, бо родныя папярэдзілі: «Не падвядзі!»

Адукацыйны працэс у Ваеннай акадэміі і на ваенных факультэтах грамадзянскіх вышэйшых навучальных устаноў Беларусі адпавядае ўсім тым тэндэнцыям, якія ініцыюе Міністэрства адукацыі. У першую чаргу, гэта тычыцца пераходу да новых адукацыйных стандартаў трэцяга пакалення з улікам дыферэнцыраваных тэрмінаў навучання.

— Сёлета навучальны працэс будзе арганізаваны па 21 адукацыйным стандарце, — паведаміў **начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Ваеннай акадэміі Андрэй ГОВІН.** — Згодна гэтым стандартам, намі праведзена сістэматызацыя падрыхтоўкі спецыялістаў як ваеннага, так і грамадзянскага профілю, ажыццёўлены ўхіл на практычную падрыхтоўку курсантаў. Ужо не першы год адметная асаблівасць адукацыі Ваеннай акадэміі — шчыльнае супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі. У прыватнасці, з арганізацыямі АДКБ. Нядаўна, напрыклад, курсанты вярнуліся з расійскага палігона, дзе прайшлі стажыроўку і ўдзельнічалі ў рэальных пусках, выконваючы разам з расійскімі ваеннаслужачымі баявыя задачы.

Адзін са складнікаў падрыхтоўкі будучых афіцэраў — навуковая работа. Трэба адзначыць, што яна тут праводзіцца на самым высокім узроўні. Пра што сведчыць хаця б тое, што, у адрозненне ад тэндэнцый грамадзянскай адукацыі, дзе тэмы дыпломных работ распрацоўваюцца на выпускаючай кафедры, тэмы дыпломных работ курсантаў перад напісаннем абавязкова ўзгадняюцца з заказчыкам.

...Не сакрэт, што мы даўно імкнёмся стаць удзельнікамі Балонскага працэсу. Выкананне ўсіх адукацыйных стандартаў набліжаюць нас да гэтай мэты. Вялікі крок у гэтым «падарожжы» робіць і галоўная ваенная ВНУ краіны.

Вераніка КАНЮТА

■ Смак цывільнага жыцця

ГЭТА САЛОДКАЕ СЛОВА «ЧАПОК»!..

Фота Надзеі БУЖАН.

— Галубцы, гарачыя галубцы! Хлопцы, бярыце хот-догі! Толькі з печкі выцягнула! А якія ў нас піражкі! Паспрабуйце — не пашкадуеце, а пасля па дабаўку прыбяжыце. Сто адсоткаў даю!

Бадзёрая прадавец у буфеце рэкламавала сваю прадукцыю не менш актыўна, чым прадаўцы на сталічнай Камароўцы. Адначасова з прасоўваннем у масы тавару яна паспявала разліваць у пластыкавыя кубачкі гарбату, рэгуляваць чаргу... і даваць жыццёвыя парады. Гэткія сітуацыі сто разоў бачыў у звычайных беларускіх кавярнях, аднак ніколі не мог падумаць, што нешта падобнае сустрэну ў войску.

ШТО МОЖНА НАБЫЦЬ, КАЛІ ЗАЗІРНУЦЬ У «ЧАПОК»:
— Кандытарскія вырабы.
— Напоі, гарбату і каву.
— Піражкі.
— Канцылярскія вырабы.
— Шкарпэткі.
— Фарбу для абутку.
— Падшывачны матэрыял.
— Рэчы туалету.

Пра тое, што ў арміі ёсць буфеты, пачуў яшчэ ад свайго бацькі, які пры Саюзе служыў пад Патсдамам, у групе савецкіх войскаў у Германіі. Так званы «чапок» (салдацкая чайная) знаходзіўся на тэрыторыі вайсковай часці. Палову аднапавярхоўкі займала памяшканне, дзе разам з прадуктамі можна было набыць залацістыя гузікі з зорачкамі, падшывачны матэрыял, адэкалон «У палёт!», рознакаляровыя ніткі... А ў суседняй зале хлопцы ў камуфляжы маглі папіць гарбаты з печывам і нават нямецкую «Штэрн Колу», пра якую ў краіне Саветаў на пачатку 1980-х ведалі толькі аматары замежных камандзіровак. У чайную салдаты хадзілі, зразумела, калі атрымлівалі грашовае забеспячэнне. Рабілі праменад у вольны час. У іншым выпадку прадпрымальны салдат мог лёгка нарвацца на чарговы нарад. «Звычайная ежа надакучвала, а таму хацелася салодкага, нечага схаванага ў прыгожай нямецкай абгортцы», — з настальгіяй узгадваў армейскую службу мой бацька.

Цалкам зразумець яго словы я здолеў толькі тады, калі сам апынуўся за шэрым армейскім плотам. У нашай вучэбцы кармілі добра, сытна, аднак да ралета з надпісам «Буфет», які знаходзіўся ў сталовай, з кожным днём цягнула ўсё больш і больш. За прылаўкам па адэкватных цэнах разлівалі напоі, каву, прадавалі шакалад, цукеркі, кандытарскія грыбочкі і сандвічы. А на высокіх паліцах у скрынях стаялі алоўкі, у стопках ляжалі шкарпэткі і тоўстыя сшыткі. Вось яно, сапраўднае поле цудаў для тых, хто не можа штодня наведваць улюбёную краму! Грошы знікалі адразу, а чарговае пірожнае, схаванае за шчакой, прымушала з сумам узгадваць салодкае грамадзянскае жыццё. Гэта ўжо пасля мы дамаўляліся і адпраўлялі ў «чапок» аднаго хлопца, а адразу тоўпіліся ў вялікіх чэргах, хавалі ў бушлатах усё тое, што толькі маглі схаваць кішэні зімовай вопраткі. Дарэчы, захоўваць у форме прадукты строга забараняецца, а таму харчы «знішчаліся» адразу пасля вячэры, калі салдат меў вольны час.

Гэта было яшчэ ў снежні, а летам у нас з'явілася яшчэ адна чайная. З марозівам, смажнямі і некалькімі столікамі, за якімі можна было папіць гарбаты з салодкім круасанам. Для нас, рэзервістаў, «чапок» быў адным з улюбёных месцаў, а мы для прадаўцоў — цудоўная магчымасць папоўніць касу. У спякоту з прылаўкаў змяталася ўся вада, увесь пламбір выцягваўся з лядоўні. Упэўнены: прадаўцы намі былі задаволены, а мы яшчэ загадзя лічылі грошы напярэдадні паходаў у буфет. Між іншым, рэдкія перападлікі ўспрымаліся ледзь не як здрада, а чарговы прывоз мы праводзілі вачыма з палёгкай, маўляў, нарэшце, смачненькае прывезлі!

— Хлопцы! Колькі казаць! Хутчэй падыходзім. Піражкі чакаць не будуць — стынуць! — крычала перад галоднай салдацкай чаргой рухавая кабета, прапаноўваючы ў сурвэтцы хот-дог.

І сапраўды, у «чапок» не зарасце салдацкая сцяжына. Так было і пры маім бацьку, пры мне і будзе пры тых, хто прыйдзе пасля нас. Час ідзе, а салдацкія традыцыі застаюцца.

Тарас ШЧЫРЫ

■ Хто каго?

«...МЫЮЦЬ БАБЫ МУЖЫКОЎ, КАБ ЯНЫ НЕ ЗМЫЛІСЯ!»

Што было — было, падобна, у Аўцюках, на ФАПе. Доктар там агледзеў чарговага пацыента, выпісаў яму рэцэпт. Думаў, што той, як іншыя, — падзякуе зараз ды сыдзе. Хворы ж — не. Ён у паперку глянуў ды кажа: «А ведаеце — мне зусім не гэткі дыягназ ставілі... Іншыя дактары». І ва ўсе вочы на гэтага глядзіць: спадзяецца, мусіць, што той зараз насцярожыцца, засумняваецца, папытае: «А які?.. І чым лячылі?»...

Той жа галаву ад папер падняў і хвораму сказаў: «Ідзіце... Памраце — анатаміраванне пакажа, хто з нас, урачоў, памыляўся».

Здымак (кіньце вокам на верхні), думаеце, зусім не пра гэта? Як сказаць, бо хворага на ім убачылі многія.

Да таго ж менавіта «анатаміраванне» (у нашым выпадку, канвертаў...) здольнае паказаць, хто з удзельнікаў конкурсу на лепшы подпіс да здымка рацыю меў, а хто памыляўся. Таму, як заўжды, па парадку.

«Не ведаю, як іншым, а мне дык вельмі спадабаўся чарговы здымак! З яго і без подпісу нарагатацца можна, — піша спадарыня **Ірына Ермаковіч з вёскі Азяраўцы Браслаўскага раёна.** — Але ж аўтару, спадару Клешчуку, як нікому, відаць, цікава, а што ж на гэты раз убачылі людзі, што ўспомнілі?»

Успомнілі, як і варта было чакаць, жнівеньскую спякоту. І менавіта гэты ўспамін **спадару Валерыю Гаўрышу з Чавусаў** прадыктаваў радкі:

Даражэнькі камунгас,
Ты прымі наш «дзякуй»
звонкі,
Бо ад спёкі ў летні час
Сапраўды ратуюць нас
Не фантаны, дык калонкі!

Успомнілі (прынамсі, **спадар Мікалай Старых з Гомеля**) казкі:

Калісьці казачны герой
Праблемы меў з жывой вадой.
Амаль паўсвету ён прайшоў,
Пакуль такую не знайшоў.
Але ж цяпер — бруяць крыніцы:
Вады ў калонках — аж заліцца!
Хоць колькі рухаў дапамогі —
Глядзіш —
любы паўстаў на ногі!

Што, згадзіцеся, вельмі важна! А ўжо пасля цяжкай працы...

Гэта — з песні ўсім вядомай:
Ясь з касьбы
прыйшоў дадому.
Канюшыны шмат скасіў
Ды Яніну папрасіў
Халадзёначкай абліць
Каб не чуць, што ўсё баліць.

Менавіта яна, тая халадзёначка, на думку **спадара Аляксандра Матошкі з г.п. Расоны,** можа вярнуць бадзёрасць, начыста змыць стому, а галоўнае, бруд, бо гэта

Дзесьці акіяны,
Моры і фантаны,
А у нас звычайна
Вось такая «ванна».

Канстатуюць **сужэнцы Астроўскія з г. Мінска.**

Спадар жа Сцяпан Нефідовіч з вёскі Любань Лунінецкага раёна маналог жанчыны падслухаў. Яна (са здымка... кінулі вокам?) кажа ўсім:

Муж працуе на камбайне,
І няма ў калгасе душа...
Дык свінчом
хадзіць не стане:
Пад калонкай вымыць мушу.

Бо што яшчэ застаецца?

Анекдот у тэму. Два мужыкі — бацька і сын — на цягнік спазняюцца: едуць на таксі, з цяжкімі чамаданамі з усіх сіл бягуць на станцыю, нават дабягаюць ужо... Цягнік (што крыўдна — пад саменькім носам у іх!)... дзверы зачыняе — і цю-цю, як той казаў... Маладзейшаму ад відовішча мову адняло, а старэйшы — руку адводзіць і як дасць яму ў вуха! «Татка, за што?» — не разумее той. «А што рабіць мне? Што рабіць?» — пытаецца бацька...

Ну насамрэч — яно ж трэба... Хоць нешта.

Лічыць так і **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў:** уважліва паглядзеўшы на здымак, яна сама ў сябе пытае (і потым сама ж сабе адказвае):

Што рабіць,
калі мора далёка,
Каля рэчкі
вісіць «забаронка»
І даймае бязлітасна спёка?
Ды адно —
з галавой пад калонку.

Хоць пад ёю, на думку **спадарыні Ірыны Ермаковіч з Браслаўшчыны,** і не мыццё:

Ну вось кажуць: «Без вады
Ні туды і ні сюды».
Але і з ёй бывае «цуд»:
Зверху чыста, знізу — бруд.

А горш за тое (і на думку той жа аўтаркі):

Асвяжыцца ранкам рад
Ля калонкі сват Панкрат...
Не бяда была сагнуцца,
А вось потым разагнуцца...

Праўда, з гэтым, прыгледзеўшыся да здымка, можна і не спяшацца. Бо

І была, і ёсць прычына
Гэтак поўзаць ля дзяўчыны!
Не так трэба хлопцу мыцца,
Як на ножкі падзвіцца.

А ўжо зблізку...

На думку таго ж аўтара — **спадара Міколы Кісяля з Мінска,** — гэта не толькі прыемна, але і вельмі карысна! Чым? Не то пра сябе (бо з веданнем справы), не то пра героя здымка Мікола піша:

Крыкма роў —
не распрануцца:
Неўралгія прыдушыла...
А тут змог кручком сагнуцца,
Так спадніцай «палячыла»!

Заўважылі — ніякіх дактароў, ніякіх лекаў, ніякіх расходаў часу і грошай! А вынік...

Дык можа ўсім, захварэўшы, трэба найперш спадніцу шукаць?

У конкурснай пошце, дарэчы, ёсць думка, што гэты мужык са здымка якраз знайшоў! І вось зараз...

Аж сыпле макам
Мужык ля бабы:
То стане ракам,
То нават крабам,
Або амарам,
Або кальмарам...
Абы ў аглоблі...
Любым макарам!

Лічыць так **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна.** Ад яго ж:

Хай выгоды і ў двары,
Але ж чорт яго бяры!
Калі дзеўка зграбная,
З тварыку прывабная,
Значыць, лёс ужо такі,
Згодзен я ў прымакі!

Вось так. Згодны... Нягледзячы ні на што... Хоць **сужэнцы Астроўскія з Мінска** і сцвярджаюць, што цяпер

У модзе не каханне
Ды рачныя воды...
У модзе — развітанні,
Звады і разводы.

Ёсць, ёсць, на жаль, рацыя і ў гэтых словах!

А ў конкурснай пошце нават пералік праблем, з-за якіх узнікаюць канфлікты, разбураюцца сем'і. У прыватнасці, **спадарыня Любоў Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна** ўбачыла на здымку не што іншае, як спробу паправіць здароўе, — так бы мовіць, пасля ўчарашняга. Калі...

Запрашалі цесць і цешча
Смачна піць і смачна есці...
З'еў і выпіў — да халеры...
Ох, і цяжанька Валеру!

А таму, па меркаванні **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў:**

Калі нейкі там гаротнік
Выпаўзае з падваротні,
Не крычыце: «Участковы!»,
Ў выцвярэзнік не званіце:
Жонка мае курс сталёвы —
Адвучыць гарэлку піці.

І гэта ў яе нават атрымліваецца, паводле слоў **спадара Юрыя Вінаградава з Бабруйска,** бо:

Чуць жывенькі быў
наш Франак
Ад спякоты і ад п'янак.
Аднак жонка ля калонкі
Змыла бруд і самагонку!

Больш за тое (думка **спадарыні Чыгрынавай**) — пачула цвёрдыя абяцанні:

Ратавала жонка
Мужа ля калонкі:
Лішку ўзяў на грудзі...
Кляўся — больш не будзе.
...Цанкі-абяцанкі,
А дурніцы — радасць,
Можа, калі й кіне
Жлукціць Янка гадасць?

Хай жа Бог дае! Але, мусіць, не варта спадзявацца толькі на яго. Як піша **спадар Нефідовіч з Лунінеччыны:**

П'еш?
Не трэба ў выцвярэзнік,
Калі мець такую жонку,
Каб за шкірку й на калені —
Пад бурлівую калонку.

Куды можна яшчэ, узяўшы «за шкірку»? Падказка (не блытаць з адказам, бо над ёй яшчэ трэба і падумаць — некаму) ад **спадара Валянціна Гудачкова:**

Муж гарэлкі выпіць дуж...
Ну ці ж не сабака?
Жонка робіць яму душ,
А магла б — пад...

Ну, вы здагадаліся...

Што яшчэ могуць жонкі ў «рамках барацьбы», убачыў на здымку **спадар Аляксандр Матошка:**

«Разамлеў» вясковец Вася,
Бо зрання ўжо «заквасіў».
Каб нутро ахаладзіць,
Да калонкі поўз папіць.
Гэта сорам для мужчыны —
Поўз, не бачачы жанчыны,
Што з анучаю ў руцэ...
Мо палечыць па шчацэ?

Жорстка? Так. Але ж раптам спрацуе? Бо ў барацьбе з гэтай чумой, ці не любыя сродкі добрыя... А ўжо калі яны ад жанчыны... Якраз пра яе **спадар Анатоль Гарачоў** і піша:

Скажуць і нямыя,
Што ў кабеце сіла!
І спіну памые,
І намыліць рыла!

Для прафілактыкі, дарэчы, таксама, як лічыць **спадар Валерый Гаўрыш:**

Дужа ж ласы да дзяўчат.
Тэмпераментны Ігнат!
Так два крокі да бяды...
Прафілактыку тады
Яго жонка пачынае:
Юр любоўны залівае.

Спадзяецца «заліць» яго (вядома ж, ад імя гераіні здымка) і **спадарыня Ірына Ермаковіч:**

Хай вада струменіць, б'е,
Можа, цягу адаб'е?
Ясь абдасца, паякоча
І налева — не захоча!
Мо й няшмат... Але за год
На мільён які збярэцца...
Год беражлівасці ідзе,
Яго вітаем з жонкай
І эканомім... на вадзе:
Непадалёк — калонка!

Адно — загнаць пад яе, як справядліва зазначае **спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны,** можа не толькі жаданне сэканоміць, але і элементарная няспраўнасць у сістэме водаправода, бо ў нас жа месцамі і сапраўды:

Развялося да халеры
Фірмачоў ды інжынераў,
Спецаў, нанатэхнікаў —
Ды няма сантэхнікаў.

Аднак не ў традыцыях, як быццам, завяршаць чарговы конкурсны агляд на сумных нотах. Тым больш — прыхаваўшы (ад **спадара Анатоля Гарачова** аптымістычныя:

Звычаі спакон вякоў
Не перамяніліся:
Мыюць бабы мужыкоў,
Каб яны не змыліся!..

Нешта ў гэтым, згадзіцеся, ёсць! І нават будзе! Хочацца верыць, заўсёды! Як і працяг у гульні «Хто каго?». А таму самы час падвесці вынікі папярэдняга этапу. На здымку тады, нагадаем, досыць сталага веку мужчына на веласіпедзе некуды вёз даму...

Па меркаванні вялікага чытацкага журы, самыя ўдалыя радкі пра гэтую пару напісалі спадарыні ЧЫГРЫНАВА з Вілейшчыны і ГРЫШЧАНКА з Дзяржынска, сужэнцы АСТРОЎСКІЯ з Мінска, спадары Юрый ВІНАГРАДАЎ з Бабруйска, мінчанін Мікола КІСЕЛЬ і Анатоль ГАРАЧОЎ з Іўеўшчыны.

Яго радкі *(Мець каханку — то задужа,/ Бо не выйдзе ўсё, як след:/ Не падзеляць бабы мужа,/ А тым больш — веласіпед!)* набралі максімальную колькасць балаў і ад журы маленькага — рэдакцыйнага. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету «Звязда» на чацвёрты квартал накіроўваецца ў вёску Даўнары Іўеўскага раёна.

Вызначыла пераможцу і рэдакцыя «Вожыка». Ім, а значыць, атрымальнікам кастрычніцкага нумара часопіса, стаў... **Анатоль Гарачоў.**

Вы таксама хацелі б атрымліваць гэтыя беларускамоўныя выданні? Ухвальнае жаданне! Тады падпісвайцеся. Альбо ўважліва глядзіце на новы (ніжні) здымак, складайце вершы (можна шмат, але не больш, чым па восем радкоў) і дасылайце ў рэдакцыю. Перамагчы — магчыма!

Валянціна ДОЎНАР,
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

P. S. *Шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі строгага конкурснага адбору (часам, што крыўдна, з-за аднаго рускага слова, якое ў перакладзе на беларускую разбурала ўсю канструкцыю верша)... А яшчэ спадзяёмся, што накасіўшы сена, назапасіўшы дроў, выбраўшы бульбачку, наварыўшы варэння, прыехаўшы з адпачынкаў, забыўшы крыўды і г.д. да ўдзелу ў конкурсе вернуцца ўсе, хто ў свой час так прыгожа да яго далучыўся, хто перамагаў...*

Пішыце! Бо напісанае і сапраўды застаецца, а не напісанае — гарантыя — не надрукуецца.

Каб усё ды так проста было! А то ж не! Як сцвярджае **спадарыня Валянціна Гудачкова:**

Жарсць не студзіць і вада,
Калі дзеўка малада!

А калі яшчэ і каханая...

Зрэшты, што мы ўсё пра высокае — пра пачуцці ды ўзаемаадносіны, калі на здымку разгледзелі чытачы і больш празаічную, надзённую праблему:

Янка мыецца старанна,
Бо вада ў калонцы... танна.
А папраўдзе — задарма:
Там лічыльнікаў няма! —

усклікае **спадар Віктар Трайкоўскі з Мінска.**

Падобныя думкі і ў **спадара Сцяпана Нефідовіча з Лунінеччыны:**

У доме ёсць водаправод,
Ды вада ж за грошы льецца:

«НА БЕЛАРУСІ БОГ ЖЫВЕ», — упэўнены дзеці з Быхава

Менавіта гэты верш Уладзіміра Караткевіча чытала адна з пераможцаў раённага конкурсу «Жывая класіка» Кацярына Алёшына.

Дзяўчынка прызналася, што згодна з пісьменнікам: на Беларусі Бог сапраўды жыве. Таму яна і выбрала гэты верш з некалькіх, прапанаваных настаўнікамі. Тым больш што Уладзімір Караткевіч — яе любімы аўтар, бо ён любіў Беларусь, любіў нашу мову. Кацярына расказала, што ёй надзвычай падабаецца чытаць вершы. І нават калі ў школе не задаюць нейкіх твораў, але штосьці прыходзіцца ёй даспадобы, яна абавязкова вывучыць гэта на памяць.

Другой пераможцай конкурсу стала Ёсмін Паяндаева. Гэта дзяўчына расказала карэспандэнту «Звязды», што яе сям'я прыехала ў Беларусь з Таджыкістана, калі Ёсмін было ўсяго 4 месяцы. Таму ад самага нараджэння яна адчувае сябе беларускай. Нашу мову вучыла ў школе разам з астатнімі дзецьмі, і гэта давалася ёй зусім лёгка. Сімвалічным аказаўся і выбар твора, які чытала ўдзельніца, — «Родная мова» Максіма Танка. Другі любімы яе аўтар — Якуб Колас.

Сапраўднае замілаванне выклікала беларуская класіка, якую чыталі школьнікі. З'яўлялася ўпэўненасць, што з роднымі словамі, якія вымаўляюць дзеці, наша мова і літаратура пераходзяць да новага пакалення, замацоўваюць сабе шлях у будучыню.

Для саміх дзяцей гэтыя вершы таксама на ўсё жыццё застануцца ў памяці. Бо гэта іх перамога, іх выступленне на вялікай сцэне перад шаноўнымі гасцямі. Гэта кропелька славы, якая дапамагла больш паверыць у самога сябе. Такі момант яднання з чыстым родным словам у іх сэрцы будзе жыць доўга, будзе натхняць у няпростыя часіны дарослага жыцця.

Конкурс «Жывая класіка» ладзіўся ў межах Свята беларускага пісьменства. Удзельнічалі ў ім школьнікі з горада Быхава і яго раёна. 18 дзяцей, што чыталі вершы ў фінале, яшчэ раней сталі пераможцамі ў сваіх установах адукацыі. Падаецца, гэта слушная ідэя. І хоць новай яе ніяк не назавеш, было б добра, каб яна стала традыцыйнай не толькі для Быхава, але для ўсёй Беларусі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара.
г. Быхаў

Уважаемые акционеры ОАО «Світанак» г. Жодино

Наблюдательный совет сообщает,
что 18 сентября 2013 года
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ОАО «Світанак»,
расположенного по адресу: г. Жодино, ул. 8-е Марта, д. 1.
Собрание пройдет в актовом зале административно-бытового корпуса предприятия (на четвертом этаже).

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
1. Создание холдинга «Белорусская трикотажная компания» с определением управляющей компанией холдинга открытого акционерного общества «Світанак», г. Жодино.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в библиотеке профкома предприятия **с 10 по 18 сентября 2013 года (время работы с 8.00 до 17.00).**
Регистрация участников собрания будет производиться **с 14.00 до 14.50 по месту проведения собрания.**
Начало работы собрания — **18 сентября 2013 г. в 15.00.**
Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 01 марта 2013 года.**
Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!
УНП 600038919

Утерянный страховой сертификат по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств – членов системы «Зеленая карта» серии BY/07/№7402317 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0531361 **считать недействительным.** УНП 101883943.

Гродненский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	капитальное строение, инв. № 420/С-4690 (назначение – здание административно-хозяйственное) общей площадью 1003,8 кв.м. Составные части и принадлежности: - забор – металлическая сетка с воротами 76 м - площадка асфальтобетонная 866 кв.м - борт дорожный 205 м.п. - борт тротуарный 595 м.п. - водопроводная сеть 168,58 м - канализационная ливневая сеть L-4, 74 м - канализационная внутридворовая ливневая сеть 44,66 м - подземная кабельная линия 36,72 м - сеть фекальной канализации 323,42 м - тепловая сеть 113,44 м (трубы стальные)
Местонахождение объекта	Гродненская область, Лидский р-н, Третьяковский с/с, р-н д. Островля
Земельный участок	Кадастровый № 423685400030000038 площадью 0,7723 га (назначение – земельный участок для обслуживания объектов промышленности)
Обременения	Сдано в аренду помещение площадью 12,5 кв.м под офис до 31.12.2013 г.
Начальная цена продажи	1 935 667 098 (один миллиард девятьсот тридцать пять миллионов шестьсот шестьдесят семь тысяч девяносто восемь) белорусских рублей **без учета НДС**
Сумма задатка	193 566 710 (сто девяносто три миллиона пятьсот шестьдесят шесть тысяч семьсот десять) белорусских рублей
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика	Капитальное строение, инв. № 420/С-4684 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, в т.ч. заправочные и газонаполнительные станции) общей площадью 1307,2 кв.м. Составные части и принадлежности: - забор – металлическая сетка с воротами 144 м. - площадка бетонная 1428 кв.м - борт дорожный 348 м.п. - водопроводная сеть 83 м - канализационная внутридворовая ливневая сеть 134,22 м - подземная кабельная линия 82 м - сеть фекальной канализации 162,34 м - тепловая сеть 25,16 м (трубы стальные)
Местонахождение объекта	Гродненская область, Лидский р-н, Третьяковский с/с, 38
Земельный участок	Кадастровый № 423685400030000055 площадью 0,6161 га (назначение – земельный участок для обслуживания объектов промышленности)
Обременения	Сдано в аренду до 05.09.2014 г.
Начальная цена продажи	3 756 201 962 (три миллиарда семьсот пятьдесят шесть миллионов двести одна тысяча девятьсот шестьдесят два) белорусских рубля **без учета НДС**
Сумма задатка	375 620 196 (триста семьдесят пять миллионов шестьсот двадцать тысяч сто девяносто шесть) белорусских рублей
Продавец	ОАО «Лида-агротехсервис» 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 17, тел. 8-0154-54-27-52
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 15 октября 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя - доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30.
Последний день приема заявлений – 9 октября 2013 г. до 15.00.

Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 10 октября 2013 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

№ лота	ЛОТ № 1
Предмет аукциона	**Право заключения договора аренды**
Наименование арендодателя	**РУП «Белоруснефть-Брестоблнефтепродукт»**
Срок договора аренды	**Три года**
Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества	1. Пункт технического обслуживания, общ. пл. 111,7 м² (инв. № 110/С-2176) (инв. № 2432Б), расположенный по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, д. 2а. 2. Часть подъездных дорог и путей (асфальтобетонное покрытие), пл. 900 м², (инв. № 2796Б), расположенного по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, д. 2а. 3. Резервуар 3 м³, (инв. № 2124Б), расположенный по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, д. 2а. 4. Щит ЩУР-Ин1 Р31 (инв. № 4834.4Б), охранно-пожарная сигнализация (инв. № 4836.3Б), расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, д. 2а
Цель использования	1. Для ремонта и технического обслуживания автомобилей. 2. Для парковки автомобилей. 3. Для сбора отработанных масел. 4. По прямому назначению
Начальная цена продажи, б.в.	**75,8775 базовой арендной величины**
Сумма задатка, б.в.	**7,58775 базовой арендной величины**
Условия	1. С победителем аукционных торгов в течение 10 раб. дней будет заключен договор аренды. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка. 3. Возместить организатору аукционных торгов в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о аукционе затраты на организацию и проведение торгов
Аукцион состоится 10 октября 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325	

Для участия в аукционе необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр »Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица)
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 **в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
Последний день приема заявлений – 09 октября 2013 г. до 17.00.
Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81. УНП 102353509

Краіна здароўя

Выпуск № 9 (310)

■ Газета «Звязда» + www.doktora.by

ЗВЯРТАЕМСЯ ДА СТАМАТОЛАГА

На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by газеце «Звязда» адказалі намеснік галоўнага ўрача 4-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі г. Мінска Людміла ВЯЧЭРСКАЯ і ўрач-стаматолаг 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Людміла ЖУГІНА.

— Дзіцяці 1 год і 8 месяцаў. Верхнія чатыры зубы моцна пацямнелі, асабліва каля карэння, і звонку, і ўнутры. Адзін зуб адламаўся. Унутры ён таксама цёмны. Адкалоўся кавалачак і яшчэ ад аднаго зуба. Падкажыце, калі ласка, што рабіць? Як папярэдзіць крышэнне зубоў?

— Самым распаўсюджаным захворваннем у дзяцей ва ўзросце да 1,5-2 гадоў з'яўляецца ранні дзіцячы, або «бутэлечны», карыес, які звычайна паражае ўсю паверхню пярэдніх зубоў. Ён развіваецца па прычыне парушэння рэжыму харчавання дзіцяці: начное салодкае піццё, кармленне паміж асноўнымі прыёмамі ежы. Карыес — гэта інфекцыйны працэс, і нярэдка інфіцыраванне ротавай поласці ў дзяцей адбываецца падчас аблізвання дарослымі соскі, іх прывычкі «спрабаваць» ежу з лыжкі, пры пацалунках. Са з'яўленнем першага малочнага зуба бацькі павінны штодня чысціць зубы дзіцяці — раніцай і ўвечары пасля прыёму ежы. Да крышэння і змянення колеру зубоў у дзяцей могуць прывесці і іншыя фактары: траўма зуба, прыроджаная паталогія цвёрдых тканак зубоў. Калі ў дзіцяці змяніўся колер зубоў, адламалася частка каронкі зуба, дзіця неабходна паказаць урачу-стаматолагу. Завочна тут нельга даць дакладную рэкамендацыю.

— У дачкі пасля выпадзення малочных зубоў карэнныя расткі няроўна. Пакуль змяніліся толькі ніжнія і верхнія «адзінкі» і «двойкі». Калі будзе правільным іх раўняць?

— Прафілактыка зубасківічных анамалій у дзяцей праводзіцца з моманту прарэзвання зубоў з улікам іх узросту і наяўнасці пэўных фактараў. Калі зубы памяняліся і растуць няправільна, рашэнне аб неабходнасці апаратурнага лячэння прымаецца пасля агляду і кансультацыі ўрача-артадонта. Апаратурнае лячэнне можа праводзіцца як з дапамогай індывідуальных, так і стандартных артадантычных апаратаў.

— Са з'яўленнем першых зубоў у дзіцяці імкнулася іх даглядаць, праціралa марлевай сурвэткай або проста ватным тампонам, змочаным у вадзе, выкарыстоўвала сіліконавыя дзіцячыя шчотачкі. Зараз нам 1 год 7 месяцаў. Я па-ранейшаму праціраю дзіцяці зубы. Акрамя таго, мы чысцім зубкі самастойна, «як мама», часам выкарыстоўваем дзіцячую пасту без фтору. На жаль, верхнія зубы бліжэй да дзясны пацямнелі. Як папярэдзіць з'яўленне карыесу? Ці неабходна выкарыстоўваць гель «Рокс» для прафілактыкі? Недзе прачытала такія рэкамендацыі:

♦выкарыстоўваць дзве зубныя пасты: адну без фтору (Рокс 0-3, Сплат baby, Лакалют да 4 гадоў), другую з фторам (Рокс kids, Сплат junior, Лакалют kids). І чаргаваць іх — раніцай і ўвечары;

♦0,05-працэнтны раствор хлоргексідзіну — змочваць ватную палачку і праціраць зубкі 1 раз у дзень (напрыклад, на ноч пасля чысткі зубоў) 2 тыдні;

♦гель Рокс (medical minerals) — 2 разы ў дзень 1 месяц. Пасля чысткі зубоў нанесці пальцам на зубкі і 1 гадзіну пасля гэтага не есці і не піць;

♦адмовіцца ад начных кармленняў (або пасля кожнага праціраць зубкі);

♦сказаць «не» салодкаму і сокам.

З чым пагадзіцца? Адмовіцца ад начных кармленняў нам не ўдалося.

— Як ужо раней паведамлялася, самым распаўсюджаным захворваннем у дзяцей ва ўзросце да 1,5-2 гадоў з'яўляецца ранні дзіцячы, або «бутэлечны», карыес. Ён развіваецца па прычыне парушэння рэжыму харчавання дзіцяці. Як-раз з-за начнога салодкага піцця, кармленняў паміж асноўнымі прыёмамі ежы. Любыя салодкія напоі, фруктовыя сокі, дзіцячыя сумесі могуць разбуryць зубы, паколькі на паверхні пярэдніх зубоў назапашваюцца вугляводы, якія і разбураюць няспелую эмаль зубоў. Карыес — гэта інфекцыйны працэс, і нярэдка інфіцыраванне ротавай поласці ў дзяцей адбываецца па віне дарослых. Скажам, падчас аблізвання соскі, пробы ежы з лыжкі, пры пацалунках. Асабліва небяспечная перадача мікраарганізмаў ва ўзросце да 2,5 гадоў, калі адбываецца прарэзванне зубоў. Папярэдзіць інфіцыраванне можна шляхам пазбягання «слінных кантактаў» з дарослымі. Адным з галоўных прафілактычных метадаў ранняга дзіцячага карыесу з'яўляецца дасканалая гігіена ротавай поласці дзіцяці. Са з'яўленнем першага малочнага зуба бацькі павінны штодня чысціць зубы дзіцяці — раніцай і ўвечары пасля прыёму ежы. З выбарам зубной пасты, прымяненнем іншых прафілактычных сродкаў (лакаў, пенак, геляў) павінен дапамагчы лечачы ўрач-стаматолаг.

— У мяне мезыяльны прыкус. Сабралася на аперацыю, але потым спалохалася. Наколькі складаная аперацыя па выпраўленні такога прыкусу? Як часта бываюць ускладненні, якога кшталту? Наколькі вопытныя хірургі ў Беларусі ў гэтай сферы? Ці можна вылучыць найбольш вопытных для такой аперацыі хірургаў?

— Каб ацаніць характар хірургічнага ўмяшання, неабходна вас бачыць. Вы можаце звярнуцца, напрыклад, у прафесарска-кансультацыйны цэнтр Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, які працуе на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння па вул. Макаёнка, 17 у Мінску. Тэлефон для даведак: 265 06 25. Вам неабходна папытацца пра кансультацыю спецыялістаў кафедры сківічна-тварнай хірургіі. Можна пракансультавацца як непасрэдна ў загадчыка кафедры — Аляксандра Сяргеевіча Арцюшкевіча, так і ў іншых спецыялістаў кафедры.

— Мая дзяўчына лечыцца ў стаматалогіі «Медыцынская ініцыятыва» па вул. Чырвонай у Мінску. Лечыць верхні карэнны зуб. Першы раз, калі яна прыйшла на прыём, зрабілі здымак двух зубоў — з аднолькавай праблемай. На другім прыёме з аднаго зуба выдалілі нерв і паставілі часовую пломбу. Калі першую часовую пломбу выдалілі і пачысцілі тры каналы, паставілі другую часовую пломбу. Гэта каштавала 580 тысяч рублёў. Пасля высветлілася, што неабходна прыйсці яшчэ і замест пломбы паставіць «каронку»... Усё гэта будзе каштаваць 1,7 млн рублёў. Узнікаюць пытанні. Чаму лечачы ўрач адразу не сказаў, колькі павінна быць працэдур і колькі гэта будзе каштаваць? Ці лічацца дзеянні ўрача неправамернымі ў дачыненні да пацыенткі з-за недастатковага інфармавання? Калі арганізацыя такім чынам «разводзіць» кліента, то якія меры прымаюцца ў такім выпадку?

— Падчас звароту ў камерцыйны медцэнтр на кожнага пацыента заводзіцца стаматалагічная амбулаторная картка. На прыёме ва ўрача ротавую поласць павінны агледзець, запісаць зубную формулу, пры неабходнасці правесці рэнтгенаўскае даследаванне. Далей урач складае план лячэння пацыента. План лячэння растлумачваецца пацыенту, падпісваецца і ўрачом, і пацыентам. У плане лячэння ёсць і такі запіс: «Я меў (мела) магчымасць задаць усе цікавыя для мяне пытанні і атрымаць неабходную вычарпальную інфармацыю». Акрамя таго, пацыент падпісвае «папярэднюю згоду на медыцынскае ўмяшанне». Што да звароту ў выпадку, калі пацыент застаўся незадаволеным медыцынскім абслугоўваннем, то ў першую чаргу для высвятлення сітуацыі неабходна звяртацца да кіраўніцтва лячэбнай установы — галоўнага ўрача паліклінікі або дырэктара медцэнтра, іх намеснікаў.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Доктар адкажа

ВАКЦЫНА... АД РАКУ

«Падкажыце, для чаго неабходны скрынінг па раку шыйкі маткі? Ці сапраўды кожнай жанчыне варта з мэтай прафілактыкі менавіта гэтага захворвання кожны год праходзіць агляд у гінеколага?

Кацярына, г. Мінск».

Акушэр-гінеколаг кабінета паталогіі шыйкі маткі 25-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Гузэль ШЫНКЕВІЧ:

— Штогод у свеце дыягнастуецца каля 500 тысяч новых выпадкаў раку шыйкі маткі, і штогод ад яго гінуць каля 230 тысяч жанчын. Такому захворванню заўсёды папярэднічаюць перадпухлінныя змяненні эпітэлію, якія называюцца дысплазіямі. Рак шыйкі маткі звычайна развіваецца павольна — на працягу некалькіх гадоў, хоць ёсць і выпадкі, калі яго развіццё працякае досыць бурна. Пры адсутнасці лячэння дысплазія прагрэсуе ад лёгкай формы да ўмеранай і цяжкай. Цяжкая ступень дысплазіі не выключае ўнутрыэпітэльнага раку. Гэта ранняя стадыя неінвазіўнага раку патрабуе лячэння ў гінеколага-анколага.

Рак шыйкі маткі — захворванне, якое можна папярэдзіць, калі яно выяўлена на стадыі перадраку або на ранняй стадыі раку.

Для ранняй дыягностыкі гэтай паталогіі прымяняецца цыталагічны скрынінг, або тэставанне ўсіх жанчын, у якіх сімптомы могуць не праяўляцца. Скрынінг прызначаны для выяўлення перадракавых змяненняў. Дзякуючы гэтаму рак шыйкі маткі можа быць выяўлены на самых ранніх стадыях і поўнасцю вылечаны. Скрынінг забяспечвае дастатковую абарону, калі паўтараецца рэгулярна. Ён павінен праводзіцца штогод пасля першага сексуальнага кантакту.

Жанчынам, у якіх падчас скрынінгу выяўлены парушэнні, неабходна далейшае назіранне, абследаванне і лячэнне. Прымяняюцца метады паглыбленага даследавання — пашыраная кальпаскапія, гісталагічнае даследаванне, пацвярджэнне наяўнасці ДНК віруса папіломы чалавека (ВПЧ) у цэрвікальным эпітэліі. Роля вышэйзгаданага віруса ва ўзнікненні дысплазій і раку шыйкі маткі даказана: звыш 90 працэнтаў выпадкаў захворвання выклікана менавіта гэтым вірусам. Існуе звыш 100 тыпаў ВПЧ, і каля 15 з іх выклікаюць утварэнне атыповых клетак цэрвікальнага эпітэлію. Пазней гэтыя клеткі могуць прагрэсаваць у ракавыя.

ЖАНЧЫНЫ ЧАСТА ЗАДАЮЦЬ ПЫТАННЕ: ЦІ ЗАЎСЁДЫ ТРЭБА ЛЯЧЫЦЬ ІНФЕКЦЫЮ, ВЫКЛІКАНУЮ ВІРУСАМ ПАПІЛОМЫ ЧАЛАВЕКА? НЕ. ЛЯЧЭННЕ НЕАБХОДНА ТОЛЬКІ Ў ВЫПАДКУ ВЫЯЎЛЕННЯ ЎРАЧОМ ПАТАЛАГІЧНЫХ ЗМЯНЕННЯЎ НА ШЫЙЦЫ МАТКІ ПРЫ ЦЫТАЛАГІЧНЫМ ДАСЛЕДАВАННІ І (АБО) КАЛЬПАСКАПІІ.

Большасць жанчын пасля інфіцыравання пазбаўляецца віруса на працягу 6 месяцаў — максімум года. Яны могуць нават не ведаць, што ў іх была гэтая інфекцыя.

Верагоднасць інфіцыравання ВПЧ павялічваецца пры наяўнасці наступных фактараў:

1. Ранні пачатак палавога жыцця, калі клеткі эпітэлію шыйкі маткі з'яўляюцца няспелымі, а таму схільныя да пранікнення віруса.

2. Наяўнасць многіх палавых партнёраў, сексуальных кантактаў.

3. Адсутнасць выкарыстання механічнай кантрацэпцыі — прэзерватыва.

Даказана, што вельмі эфектыўным метадам прафілактыкі з'яўляецца вакцынацыя. Паводле даследаванняў, калі масава вакцынаваць усіх жанчын, то праз 50-60 гадоў можна будзе наогул забыцца на рак шыйкі маткі. Вакцынацыя рэкамендуецца дзяўчынкам, пачынаючы з 12 гадоў, аднак праводзіцца ў любым узросце да 50-55 гадоў. Вакцынацыя праводзіцца ў тры этапы на працягу 6 месяцаў. Прэпарат уводзіцца ў арганізм з дапамогай унутрымышачнай ін'екцыі.

Такім чынам, становіцца зразумелым, што канцэпцыя скрынінгу ў ахове здароўя — актыўнае выяўленне хваробы або прыкмет магчымага яе з'яўлення ў людзей, якія лічаць сябе здаровымі. І гэта вельмі дзейсны інструмент у прафілактыцы раку.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Інфарм-укол

АД ЧАГО Ў ДЗІЦЯЦІ ГАЛАВА БАЛІЦЬ?

Сярод школьнікаў і падлеткаў эпізадычны галаўны боль з'яўляецца адной з найбольш частых скаргаў на прыёме ва ўрача. Сярод хваравітых станаў галаўны боль займае ў насельніцтва Зямлі трывалае другое месца пасля болю ў жываце.

Як правіла, галаўны боль з'яўляецца ва ўзросце 4-5 гадоў, калі дзіця вучыцца ўспрымаць і апісваць хваравітыя месцы. Звычайна кажуць пра два пікі росту частаты галаўнога болю пасля 3 гадоў: у дзяцей 6-7 гадоў гэта звязана са стрэсам, паходам у першы клас, а ў 12-14-гадовых — з палавым выспяваннем.

Лячэнне эпізадычнага галаўнога болю ў раннім дзіцячым узросце можа папярэдзіць хранічную форму захворвання ў падлеткаў і дарослых, адзначае інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ.

Прычынамі галаўных боляў могуць быць, напрыклад:

— чэрапна-мазгавыя траўмы, траўмы пазваночніка, анкалагічныя захворванні, эпілепсія, афтальмалагічныя паталогіі, менінгіт, паталогія вуха-горла-носа;

— родавая траўма шыйнага аддзела пазваночніка, вегета-сасудзістая дыстанія.

Абавязкова пакажыце дзіця ўрачу-неўролагу або рэабілітолагу, трэба даабследавацца ў афтальмолага і атарыналарынголага.

Што правакуе галаўны боль?

1. Працяглае напружанне мышцаў пры нефізіялагічных позах — нязручны стол або парта, якая не адпавядае росту; нязручная поза падчас сну.

2. Парушэнні зроку — міопія і інш.

3. Знаходжанне ў душным памяшканні, фізічнае і разумовае перанапружанне, працяглыя спартыўныя перагрузкі.

4. Сапсаваныя стасункі ў сям'і і школе.

5. Працяглы прагляд тэлевізара.

6. Адсутнасць або недастатковая працягласць дзённага сну, вымушанае галаданне.

7. Ужыванне медыкаментозных сродкаў (празмерны прыём анальгетыкаў).

8. Перамена надвор'я.

9. Прастуда, грып.

У большасці дзяцей з галаўнымі болямі назіраюцца розныя праявы паталогіі вегетатыўнай нервовай сістэмы: пацеюць далоні, ёсць боль у сэрцы, сэрцабіццё, боль у жываце. Галаўны боль пры гэтым правакуецца стомленасцю ў школе, стрэсамі і метэаралагічным фактарам. Боль працягваецца ад адной да некалькіх гадзін, часта праходзіць самастойна пры змене роду дзейнасці, пасля адпачынку, кароткага сну.

Пры паталогіі пазваночніка дзіця можа скардзіцца на боль у шыйна-патылічнай вобласці. Такі боль узмацняецца пры нялоўкіх хуткіх рухах галавы і шыі, чханні і кашлі. Ад прымянення супрацьболевых сродкаў эфекту можа і не быць. Фізіяпрацэдуры і масаж каўняровай зоны часта прыносяць станоўчы вынік.

Галаўны боль мышачнага напружання, пастаянны і манатонны, канцэнтруецца ў лобна-сківічнай або патылічна-шыйнай абласцях. Боль сціскае і ломіць на працягу ўсяго дня. Узнікае падчас працяглага эмацыянальнага напружання, радзей — пасля фізічнай нагрузкі. Залежыць ад становішча галавы і шыі падчас урокаў, часам узмацняецца пасля сну і працяглага фіксаванага становішча галавы. Абумоўлены доўгім напружваннем мышцаў галавы і спазмам сасудаў.

Галаўны боль можа быць звязаны і са спазмам пазваночнай артэрыі. Боль у шыйна-патылічнай вобласці можа быць абумоўлены ціскам пазванкоў або мышцаў на пазваночную артэрыю. Можа суправаджацца галавакружэннем, шумам у вушах, «простымі» зрокавымі парушэннямі, стратай прытомнасці.

Галаўны боль, звязаны з вегета-сасудзістай дыстаніяй, бывае двух «відаў». У першым выпадку адзначаецца бледнасць і сухасць скуры, расшырэнне зрэнак. Канечнасці халодныя, тэмпература цела няўстойлівая. Дрэнна пераносіцца спёка, духата, шум, яркае святло, кава. Могуць узнікаць мышачнае дрыжанне, сэрцабіццё, запоры. Парушаецца сон. Маса цела нярэдка зніжана пры добрым апетыце. Фізічная актыўнасць павышаная, працаздольнасць лепшая ў вячэрні час. Здольнасць да запамінання і засяроджвання паніжаная.

У другім выпадку з'яўляюцца пачуццё гарачыні, пачырваненне скуры, павышаная вільготнасць далоняў і ступняў, дрэнная пераноснасць холаду. Могуць быць галавакружэнне, пачуццё «непаўнаты ўдыху», ванітаванне, боль у верхняй частцы жывата, дыярэя. Дзеці схільныя да набору вагі (нярэдка пры паніжаным апетыце), апатычныя, безыніцыятыўныя. Павышана санлівасць, запаволены пераход да актыўнай бадзёрасці раніцай. Назіраецца часам страта прытомнасці, алергічныя рэакцыі. Зніжана пераноснасць разумовых і фізічных нагрузак.

Якія віды даследаванняў могуць прызначацца?

➤ Ультрагук сасудаў шыі і галавы (дуплексаграфія) — для вызначэння спазму артэрыі, якая харчуе галаўны мозг.

➤ Рэнтгенаграфія шыйнага аддзела пазваночніка — для вызначэння прыкмет астэахандрозу.

➤ Ядзерна-магнітна-рэзанансная тамаграфія — пры падазрэнні на грыжу пазваночнага дыска (надзвычай рэдка ў дзіцячай практыцы) або пры адсутнасці паталогіі ў заключэнні ўльтрагуку і рэнтгенаграфіі.

➤ Пры неабходнасці праводзіцца абследаванне вочнага дна і вастрыні зроку.

Масаж і анальгетык

Лячэнне эпізадычных галаўных болеў: рэжым дня, паўнавартасны сон, зручныя ўмовы працы. Масаж галавы і каўняровай зоны, лячэбная фізкультура, іголкарэфлексатэрапія, мануальная тэрапія, серавадародныя і марскія ванны, фізіяпрацэдуры, псіхатэрапія для павышэння сацыяльнай адаптацыі. Можна прыняць анальгетык — парацэтамол. Але, калі з прыёмам спазніцца, то прэпарат не дапаможа.

Гарбата з лімонам

Лячэнне хранічных галаўных болеў: элеўтэракок, лімоннік дадаваць раніцай у гарбату. Наогул гарбата з лімонам — адзін са сродкаў павышэння тонусу. Карысная ў гэтым выпадку аскарбінавая кіслата, заспакаяльныя сродкі (валяр'ян, глог). Прызначаюцца і курсы сасудзістых прэпаратаў, антыдэпрэсантаў.

Праца — адпачынак

Самае важнае і першае — разумнае чаргаванне працы і адпачынку. Абавязкова трэба знайсці час на адпачынак! Пры галаўных болях, абумоўленых перанапружанем, наогул рэкамендуюцца заняткі лячэбнай фізкультурай, водныя працэдуры, масаж, фізіяпрацэдуры, а таксама вітамінізаванае харчаванне, дадатковы прыём полівітамінаў.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ ВІЧ — не прысуд

«РАСКРЫЦЬ» СТАТУС І АТРЫМАЦЬ ЛЯЧЭННЕ

«Чаму я жыву з ВІЧ доўга» — гэта акцыя, паводле якой на вуліцы Някрасава, 75 урачыста адкрылі білборд з выявай ВІЧ-пазітыўнага беларуса Яўгена Спевака.

«З-за стэрэатыпаў і негатыву ў дачыненні да сябе многія ВІЧ-інфіцыраваныя нават не звяртаюцца па лячэнне, баяцца гаварыць пра свой дыягназ. На маіх вачах памералі людзі, якім дыягназ «СНІД» ставілі пасмяротна. У іх медыцынскіх картках ні разу не ўзгадвалася аб тым, што яны інфіцыраваныя. Яны гадамі жылі з гэтым, і ніхто пра гэта нічога не ведаў», — расказвае член праўлення Беларускага таварыства людзей, якія жывуць з ВІЧ, Яўген СПЯВАК.

Сам Яўген жыве з адкрытым статусам з 1997 года, калі ў яго родным горадзе гэтаму паспрыялі, як ён кажа, «чыноўнікі». З 2006 года Спявак даў не адно інтэрв'ю. «Я спадзяюся, што калі не ВІЧ-інфіцыраваныя ўбачаць на плакаце звычайнага чалавека, без гнойных ран, які не пакутуе ў агоніі, як гэта падавалася ў нас раней, яны зменяць у сваіх галовах вобраз пра ВІЧ-пазітыўнага чалавека», — кажа ён.

А старшыня экспертнага савета Інфармацыйнай стратэгіі па ВІЧ/СНІДзе Беларусі Сяргей КРУЧЫНІН сцвярджае: «Чым менш у грамадстве стэрэатыпаў аб тым, што ВІЧ — смяротны прысуд, тым лягчэй будзе праводзіць прафілактыку і лячэнне».

САААЗ (Еўрапейскае рэгіянальнае бюро), Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Праграмы развіцця ААН, Эксперты савет Інфармацыйнай стратэгіі па ВІЧ/СНІДзе ў Беларусі, Беларускае таварыства людзей, якія жывуць з ВІЧ, і Міжнародная дабрачынная арганізацыя «Усходнееўрапейскае і цэнтральнаазіяцкае аб'яднанне людзей, якія жывуць з ВІЧ» і правялі ў Мінску вышэйназваную акцыю.

Ведаць — значыць выжыць

Амаль 50% людзей у свеце, якія жывуць з ВІЧ (вірусам імунадэфіцыту чалавека), не ведаюць пра сваё захворванне і таму не лечацца. У Беларусі назіраецца такая ж сітуацыя. Больш за тое, у нас, калі верыць выбарачнаму апытанню на вуліцы, яшчэ трапляюцца маладыя людзі, якія мяркуюць, што ВІЧ перадаецца з укусамі камароў, і не разумеюць сэнс словазлучэння «прыхільнасць да лячэння».

Між тым, менавіта прыхільнасць да лячэння набывае вельмі важнае значэнне. Размова ідзе ў тым ліку аб даследаванні на ВІЧ, веданні свайго статусу, і ў выпадку, калі гэты статус станоўчы, своечасовым звароце па медыцынскую дапамогу для пачатку лячэння. Бо цяпер у свеце ВІЧ-інфекцыя разглядаецца выключна як хранічнае захворванне, якое, як і любое іншае хранічнае захворванне, патрабуе пастаяннага лячэння.

Паводле слоў **каардынатара праграм Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Веры ІЛЬЯНКОВАЙ,** САААЗ заклікае пачынаць лячэнне ВІЧ-інфекцыі на больш ранніх стадыях: «Апошнія фактычныя даныя сведчаць аб тым, што дзякуючы больш ранняму пачатку антырэтравіруснай тэрапіі жыццё людзей з ВІЧ можа стаць больш працяглым і здаровым, а рызыка перадачы ВІЧ іншым людзям значна зніжаецца. Больш бяспечная і больш простая антырэтравірусная тэрапія, якая павінна праводзіцца на ранніх стадыях, можа спрыяць незваротнаму спаду эпідэміі ВІЧ».

У 2011 годзе буйное даследаванне ў некалькіх краінах паказала, што антырэтравірусныя прэпараты зніжаюць узровень перадачы ВІЧ на 96 працэнтаў сярод пар, у якіх адзін партнёр ВІЧ-станоўчы, а другі не інфіцыраваны. Калі людзі прымаюць антырэтравірусныя прэпараты, колькасць ВІЧ у іх крыві зніжаецца, што і змяншае ў значнай ступені верагоднасць перадачы віруса іншым.

Загадчыца аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІДу Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена ФІСЕНКА канстатуе, што беларусы даволі добра інфармаваны аб праблеме ВІЧ, але гэтыя веды часта павярхоўныя... Пры тым, што ў краіне ёсць доступ да лячэння, многія з тых, хто мае патрэбу ў лячэбнай дапамозе, не звяртаюцца па яе, паколькі не жадаюць раскрываць свой статус.

Намеснік галоўнага ўрача Мінскай гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Дзмітрый ПАДУТА ўпэўнены: «ВІЧ-інфекцыя — гэта хранічнае захворванне, а не прысуд. Звярнуцца па медыцынскую дапамогу ВІЧ-пазітыўнаму чалавеку ўсё роўна давядзецца, таму вельмі важна, каб ён зрабіў гэта на ранніх этапе. Сёння існуюць магчымасці для захавання якаснага ўзроўню жыцця».

«ЮНЭЙДС запусціла новую ініцыятыву для ахоплівання 15 млн чалавек антырэтравірусная тэрапіяй да 2015 года. У межах гэтай ініцыятывы пад назвай «Лячэнне-2015» краінам прапануюцца практычныя метады павелічэння колькасці людзей, якія маюць доступ да антырэтравірусных прэпаратаў», — кажа **каардынатар Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІДзе (ЮНЭЙДС) Элеанора ГВАЗДЗЁВА.**

Павінен ведаць кожны

ВІЧ — гэта вірус імунадэфіцыту чалавека. У выніку заражэння чалавек хварэе на ВІЧ-інфекцыю — невылечнае сёння, працяглае інфекцыйнае захворванне. Працяглы час пасля заражэння вірус у арганізме не прыводзіць да парушэнняў, і чалавек не адчувае сваёй хваробы. Праз гады існавання (ад некалькіх гадоў да 10 і больш) паражаецца імунная сістэма і арганізм страчвае здольнасць процістаяць не толькі размнажэнню ВІЧ, але і іншым захворванням і інфекцыям.

СНІД — сіндром набытага імунадэфіцыту з'яўляецца канчатковай стадыяй ВІЧ-інфекцыі, калі імунітэт аслаблены настолькі, што іншыя захворванні прыводзяць да лятальнага зыходу. Пры ўмове здаровага ладу жыцця, урачэбнага назірання і прыёму лекавых прэпаратаў магчымае спрыяльнае працяканне захворвання і папярэджванне развіцця СНІДу.

Як можна інфіцыравацца?

1. Палавы кантакт без прэзерватыва з ВІЧ-інфіцыраваным.

2. Выкарыстанне агульных прылад для ін'екцый, асабліва сярод спажыўцоў ін'екцыйных наркотыкаў.

3. Вертыкальны шлях перадачы: ад ВІЧ-інфіцыраванай маці — дзіцяці (падчас цяжарнасці, родаў або праз грудное кармленне).

Іншыя шляхі перадачы сустракаюцца значна радзей. Сярод іх варта адзначыць заражэнне ВІЧ праз пераліванне донарскай крыві або яе прадуктаў у краінах, дзе не ўведзена абавязковая праверка ўсіх узораў донарскай крыві на ВІЧ (у Беларусі такая праверка ажыццяўляецца). Вельмі рэдкія выпадкі заражэння пры траплянні інфіцыраванай крыві на адкрытую рану ці слізістую абалонку. Па гэтай прычыне нельга карыстацца агульнымі прадметамі асабістай гігіены (брытва, зубная шчотка, прыстасаванні для манікюру), а таксама нельга наносіць тату нестэрыльным інструментам. У медустановах не зарэгістравана ніводнага выпадку заражэння медработніка пасля трапляння слiны, мачы ці крыві ВІЧ-інфіцыраванага пацыента на непашкоджаную скуру. Ва ўсім свеце зафіксавана не больш за некалькі дзясяткаў выпадкаў заражэння ВІЧ падчас аральнага сексу. Значна вышэй атрымаць падчас аральнага сексу ўзбуджальнікаў інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам (сіфілісу, ганарэі, генітальнага герпесу, віруса папіломы чалавека).

Дзе можна абследавацца на ВІЧ?

Здаць кроў на ВІЧ можна з указаннем сваіх даных або ананімна. Аналізы на ВІЧ-інфекцыю можна здаць у працэдурным кабінеце любой паліклінікі. Для Мінска дадаткова — у гарадскім і абласным скурна-венералагічным дыспансерах, гарадскім і абласным наркалагічным дыспансерах, а таксама ў медцэнтры «Ладэ» (платна). У працэдурным кабінеце аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІД Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя (вул. К. Цэткін,4, паверх 3) можна здаць аналіз на ВІЧ ананімна і бясплатна, а таксама атрымаць кансультацыю спецыяліста. Вынік даследавання будзе гатовы на працягу 2 працоўных дзён.

Колькі можна жыць з ВІЧ?

Дзякуючы даступнасці спецыфічнай супрацьвіруснай тэрапіі прагрэсаванне захворвання можна прыпыніць на любой стадыі. Аднак калі пачаць лячэнне своечасова, і пацыент будзе прыхільным да яго — пагодзіцца выконваць усе рэкамендацыі ўрача, то лічыцца, што чаканая працягласць жыцця не вельмі будзе адрознівацца ад сярэдняй па краіне. Ёсць выпадкі, калі ВІЧ-інфіцыраваныя жывуць з інфекцыяй да 25 гадоў. У нашай краіне маштабнае лячэнне праводзіцца толькі 8 гадоў. Адназначна можна сказаць адно: чалавек, які ўжывае АРВ-тэрапію, жыве, працуе, раджае дзяцей і добра сябе адчувае.

Што такое АРВ-тэрапія?

Яна зніжае вірусную нагрузку на арганізм і прыпыняе тым самым развіццё імунадэфіцыту. Колькасць вірусных часціц бывае нават ніжэйшай за мяжу вызначэння тэст-сістэмы, але ж поўнасцю выдаліць вірус з арганізма АРВ-тэрапія пакуль не можа. У Беларусі такое лячэнне атрымлівае звыш 4500 чалавек. Лячэнне бясплатнае, што вельмі важна для пацыентаў. Пажыццёвае лячэнне ВІЧ-інфекцыі абыходзіцца ў сярэднім у 35 тысяч долараў на чалавека (у нашай краіне грошы на АРВ-тэрапію выдаткоўвае Глабальны фонд па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй).

Важна своечасова пачаць лячэнне, пакуль імунная сістэма не вельмі разбурана. Перарываць лячэнне нельга. Часам пры развіцці пабочных рэакцый або ўстойлівасці ВІЧ да прэпарата схему лячэння мяняюць.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Наш культурны асяродак

Жыранделя

Выпуск № 34 (204)

ВЯЛІКІ СЕЗОН

Сёлета ў Беларусі з'явіцца ўласны міжнародны конкурс вакалістаў

Пра гэта паведаміў дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Уладзімір Грыдзюшка на пачатку новага тэатральнага сезона. Такім чынам тэатр збіраецца ўмацоўваць імідж Мінска як «опернай сталіцы СНД», паводле слоў дырэктара. Конкурс плануюць правесці падчас Каляднага опернага форуму, які стаў традыцыйным.

З іншых традыцый — працяг практыкі абменных гастроляў: сёлета будзе магчымасць пабачыць Львоўскую оперу ў Мінску.

Для сваіх гледачоў Вялікі тэатр рыхтуе 13 прэм'ер у новым сезоне. Акрамя нацыянальнага балета «Вітаўт», чакаецца працяг спектакляў нацыянальнай оперы: «Гальку» Станіслава Манюшкі на малой сцэне паставіць Міхаіл Панджавідзэ. Гэтую ж оперу збіраюцца паказаць падчас «Вечароў Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў».

Будуць адзначаны спектаклямі 2 юбілеі: «Рыгалета» Вердзі і «Лятучы галандзец» Вагнера. З рускай класікі з'явіцца ў афішы «Пікавая дама» Чайкоўскага. Ужо ў верасні ў камернай зале імя Л. Александроўскай можна будзе паслухаць «Дырэктар тэатра» Моцарта і «Спачатку музыка, потым словы» Сальеры.

З балетных прэм'ер, якія чакаюцца ў новым сезоне, ці не самую вялікую ўвагу прыцягнуць «Шэсць танцаў» сусветна вядомага пастаноўшчыка Іржы Кіліяна. Захапленне магіяй лічбаў прадоўжыцца ў балеце «Сем прыгажунь» азербайджанскага кампазітара Кара Караева. Але пасля — якраз дарэчы падумаць пра «Сем смяротных грахоў» (беларускага кампазітара Алега Хадоскі), якія рыхтуюцца на малой сцэне для прыхільнікаў сучаснай харэаграфіі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Выставы

ЗМРОК — ГЭТА НЕ ТАК І СТРАШНА

Даказвае скульптар Уладзімір Лапо

У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску працуе выстава скульптара, мастака, вандроўніка і беларуса з брытанскім грамадзянствам Уладзіміра Лапо. Праект прэзентуе творы графікі розных гадоў і скульптуры, выкананыя ў тэхналогіі «direct cast» — прамога ліцця. Гэтая тэхналогія была вядома яшчэ ў Сярэднявеччы, вядомым нам як «змрочны час». Што, зрэшты, часткова і тлумачыць назву выставы. Але змрок як з'яву аўтар спрабуе разгледзець і з іншых, больш станоўчых ракурсаў.

Метад прамога ліцця адмаўляе мадэляванне, любое папярэдняе стварэнне працоўнай копіі на карысць рэальнага аб'екта. Гэта дадае пэўны элемент выпадковасці, спантаннасці ў стварэнні мастацкага твора, прымушае меру асабістага ўмяшальніцтва аўтара дамінаваць.

Уладзіміра Лапо часта называюць прадстаўніком маргінальнай культуры. І, па сутнасці, выстава «Крок у змрок» з'яўляецца пэўнай квінтэсэнцыяй даследаванняў душы маргінальнага чалавека, які, як гумілёўскі «пасіянары», у прынцыпе, і кіруе гэтым светам. Прынамсі здаецца, што філасофія мастака яшчэ і ў тым, што якраз маргінальная культура кіруе светам. Уладзімір Лапо — творчая асоба, чыя мастацкая дзейнасць выходзіць за рамкі агульнапрынятых стыляў і кірункаў. Мастак, графік, скульптар, стваральнік інсталяцый, літаратар у адной асобе, ён увасабляе сабой кропку дотыку дэструктыўнага і творчага працэсаў, рэальнасці і выдумкі, мастацкай і аб'ектыўнай рэчаіснасці.

Яго графіка і скульптуры наўмысна неахайныя. У прынцыпе, яны нават здольныя адштурхнуць. Але менавіта гэтая абарончая рэакцыя перад нечым незнаёмым, змрочным і цьмяным якраз і прымушае задумацца. Што гэта за свет, у якім мы жывём? Хто ўсе гэтыя людзі? Чаму яны такія злыя альбо незадаволеныя? Альбо, наадварот, сытыя, добрыя і задаволеныя, што бывае, безумоўна, значна радзей.

Уладзімір Лапо, як прадстаўнік маргінальнай культуры, знаходзіцца на памежжы асяроддзяў, груп, сістэм, адчувае ўплыў іх супярэчных нормаў і каштоўнасцяў, пры гэтым канструюе асабістую рэальнасць, крайнюю індывідуальнасць, што знаходзіць праяву ў ладзе жыцця, формах самавыяўлення, у метадах творчай дзейнасці.

Куратар выставы Наталля Паторская нездарма ўзгадвае вядомага амерыканскага сацыёлага Роберта Парка. Ён пісаў: «Такі чалавек няўхільна робіцца (у параўнанні з яго непасрэдным культурным асяроддзем) індывідам з больш шырокім гарызонтам, больш вытанчаным інтэлектам, больш незалежнымі поглядамі». Парк разумее маргінальную асобу, як безумоўна, станоўчы, канструктыўны элемент.

— Іншы сацыёлаг, Эверэт Стоўнквіст, разглядае маргінальнага чалавека як ключавую асобу (key-personality) у кантактах культур, — тлумачыць куратар. — Такое разуменне асобы ў поўнай меры можна аднесці да аўтара праекта — грамадзяніна свету.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

У КОЖНАГА СВОЙ «D.A.R.»

Калі ніхто дакладна не ведае, але ўсе здагадваюцца

У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» да 25 верасня працуе выстава жывапісу мастака і кампазітара Аляксея Хацкевіча, вядомага ў народзе як Хацон. Кірунак твораў, якія складаюць экспазіцыю, аўтар акрэслівае як дэкаратыўна-абстрактны рэалізм. І ўжо сам гэты аксюмаран настройвае на адпаведны іранічна-абсурдны, сцёбны стыль успрымання.

Мастак як бы сцвярджае, што нішто ў гэтым свеце, па сутнасці, нічога не вартае. І кожны можа ўсё і не можа нічога абсалютна ў аднолькавай ступені. Але нават няздольнасць рабіць нешта — гэта таксама своеасаблівае ўменне. Словам, у кожнага на гэтай планеце ёсць свой «D.A.R.». Нездарма выстава называецца менавіта так.

Тэорыю адоранасці кожнага і каштоўнасці кожнага дару мастак падтрымлівае наступным эксперыментам: ён дапрацоўвае малюнкі сваёй маленькай дачкі, ператвараючы іх у аб'екты актуальнага мастацтва. Гэты арт-мікс — своеасаблівы, хоць і не надта арыгінальны, выклік. Вядома, што дзіцячая творчасць, як і наогул любы наіў-арт, мае ў сабе велізарны мастацкі патэнцыял, свежы погляд, «зарад бадзёрасці» для стомленых ад творчых пошукаў мастакоў. Аляксей Хацкевіч, робячы сваю дачку суаўтарам, нібыта прамаўляе: ніхто не горшы і не лепшы за іншых, а ўсё геніяльнае, як вядома, надзвычай простае па сваёй сутнасці.

Праект Хацона пра тое, што ніхто дакладна нічога не ведае, але ўсе здагадваюцца, хіхікаюць і пераміргваюцца. Мастацтва!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ

■ Прэм'ера

КАВАРСТВА І КАХАННЕ: АЙЧЫННЫ ВАРЫЯНТ

У чым Вітаўт абышоў Ягайлу?

Браты як браты — гулялі разам, сілаю мераліся, забаўляліся. Жартачкі скончыліся са смерцю Кейстута.
І хто ведае, як там было насамрэч: ці то чорны чалавек нейкі спакусай улады заразіў, ці то сваё чорнае кожны сам у сабе песціць. А мо ўсё і не так было?.. Аднак смерць бацькі Кейстута зрабіла Вітаўта моцным і непераможным. А яго стрыечны брат Ягайла знайшоў сябе ў іншай краіне...

Яшчэ з моманту прэм'еры балета «Страсці» (пра Рагнеду) стала зразумела: гісторыя — вялікая тэма, якая можа быць асновай для нацыянальнага балета. Можа быць... І стала зноў: у гэтыя дні актыўна абмяркоўваюць прэм'еру балета «Вітаўт» кампазітара Вячаслава Кузняцова ў пастаноўцы Юрыя Траяна, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком балетнай трупы Вялікага тэатра Беларусі.

Балет і патрыятызм

Гісторыю сваёй краіны соромна не ведаць. Але колькі яе ні вывучай — заўсёды застаецца нешта, што можна адкрываць, адкрываць. І колькі ні гавары пра гісторыю — усё мала, усё роўна застаецца нехта, для каго гэта будзе ўпершыню. І ўсё роўна будуць тыя, хто захоча яшчэ і яшчэ.

Так было, напрыклад, калі ішоў у Купалаўскім тэатры спектакль «Князь Вітаўт». Ішоў доўга. Меў сваіх прыхільнікаў. Але нават калі спектакль аджыў сваё, былі тыя, хто засумаваў без Вітаўта. Без рэальнага героя. Не столькі без героя мастацкага твора (спектакля). І вось чарговая перамога нашага героя Вітаўта над забыццём: балетны варыянт. Балет, як і спектакль, звяртаецца да драматычных падзей смерці Кейстута і супрацьстаяння двух стрыечных братоў, якія прэтэндавалі на ўладу ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Што тут казаць: каб увасобіць на сцэне гэтых двух герояў, былі задзейнічаны лепшыя артыстычныя сілы. Тут цяжка паспрачацца з Юрыем Траянам, што ёсць каму ў нашай трупе ўвасабляць Вітаўта: на партыю прызначаны Ягор Азаркевіч, Антон Краўчанка, Ігар Аношка. І тыя, хто антыпода Ягайлу танцаваць могуць, ёсць: Алег Яромкін і той жа Ягор Азаркевіч. Ёсць каго і што танцаваць — паводле гісторыі. Але ключавое слова тут — «танцаваць». Харэаграфія нацыянальнага балета павінна быць адметнай, а пастаноўка выглядаць эфектнай, ствараць уражанне драмы, якая чалавека зрабіла асобай...

Што да эфектаў, то з імі ўсё ў парадку: святло, гульня колераў, дым, галава з рагамі над сцэнай, чырвонае полымя вогнішча. Сутнасць драмы вынікае з сюжэтнай лініі (калі хто ведае гісторыю) ды яшчэ з праграмкі (бо інакш цяжка разабрацца ў тым, што адбываецца) . Што ж да лініі харэаграфіі — яна таксама з нечага вынікае: з гісторыі развіцця беларускага балета ў апошнія дзесяцігоддзі…

Але так хочацца, каб гісторыя яго развіцця працягвалася, бо балет — мастацтва, якое без слоў можа пераварочваць душу (і мы ж бачылі, як гэта бывае!). І цяпер нам прапануюць новыя балетныя спектаклі, ці назвы ў афішу… Вельмі добрыя назвы: «Вітаўт» — гучыць з гонарам.

Між іншым, балет «Вітаўт» і глядзець можна з гонарам. Яго адчуюць тыя, для каго гісторыя вышэй за харэаграфію, а пачуццё патрыятызму вышэй за мэту тэатра пераварочваць душу. Тут яно, бадай, і пануе: наша гісторыя, наша трупа, наш тэатр... Слова «наш», безумоўна, сагравае, гэтак жа, як свая кашуля. Але бываюць моманты, калі думаеш яшчэ і пра якасць кашулі. А добрая якасць можа найлепш падмацаваць пачуццё патрыятызму: сваё любіць больш прыемна тады, калі яно на ўзроўні...

Тым не менш, глеба для патрыятызму ёсць: не толькі з-за самога героя, падоранага нам гісторыяй. Яшчэ адным героем балета з'яўляецца музыка да яго. І гэта для мяне было самае галоўнае: у музыцы ёсць глыбіня, засяроджанасць, разважлівасць, ёсць і экспрэсія, і напружанне, сум і надзея. Яна распавядае і нараджае вобразы, якія кожны можа ўявіць сам і ж гэтае адчуванне можа быць у любую эпоху: калі сутыкаюцца розныя каштоўнасці і маральныя сістэмы. У гэтым сэнсе для мяне гэта філасофскі спектакль. Хоць героі належаць сёння розным краінам, але ж сутнасць супрацьстаяння не ў гэтым. Гэтыя героі належаць адначасова свету. Напрыклад, гісторыя Спартака ці сюжэт «Рамэа і Джульеты» даўно выйшлі

Дырыжор-пастаноўшчык Вячаслаў ВОЛІЧ:

— У гэтым спектаклі няма ніводнай цытаты. Шмат аналогій, і ўсё выдатныя імёны прыходзяць на думку: Бартак, Пракоф'еў, Стравінскі. Але гэта арыгінальны твор кампазітара Вячаслава Кузняцова. Кампазітар вельмі тэатральны. Ён добра перадае атмасферу часу і адчувае драматургічны пульс. Мы запісалі гэты твор у аркестры паўтара года таму, тэатр пайшоў на такі эксперымент. Мне прыемна, што не было розначытанняў падчас працы над спектаклем.

суаднесці з тым, што бачыць на сцэне. Музыка — дзіўнае мастацтва, якое можа праз гукі і мелодыі даць «убачыць» і эпохі, і народы з іх асаблівым светаадчуваннем. Можа мінулае злучыць з сучаснасцю: яно ж прарастае ў нас, таму і адгукаецца, рэзаніруе.

Што ж тады ёсць чалавек, творца, які ўмее ствараць такую музыку, у якой чуеш больш, чым гэта дазваляе сюжэт, нават з рэальнымі гістарычнымі персанажамі? Вячаслаў Кузняцоў падчас стварэння балета «Вітаўт» перанёс інфаркт, але аднавіўся. І прапаноўвае аднавіцца — праз музыку — іншым. Добра, што ёсць такая магчымасць — слухаць беларускую музыку ў Вялікім тэатры...

Музыка і светаадчуванне

З аўтарам музыкі, **кампазітарам, прафесарам Вячаславам КУЗНЯЦОВЫМ** захацелася паразмаўляць пасля прэм'еры.

— Гэта ўжо не першы балет на гістарычную тэму, да якога вы напісалі музыку...

— Так, раней былі «Макбет» і «Клеапатра». На жаль, не паставілі. Мяне гісторыя натхняе. Па-першае, заўсёды можна ўявіць сябе там. Напрыклад, у Егіпце: уявіў піраміды — і нібыта перанёсся туды, стаў часткай таго свету... У выпадку з «Вітаўтам» таксама дапамагала працаваць уяўленне. Уяўляў сябе спачатку ў лясах Вялікага Княства Літоўскага, потым у замку Кейстута. Далей — у Кракаве, дзе пануе бляск. Адсюль і адчуванне сутыкнення двух сусветаў. Але за рамкі адной культуры. Гэта гісторыя агульначалавечая.

— Напэўна, немагчыма пісаць музыку пра тых, каго ты не прыняў ці не палюбіў?

— Героі гэтага балета вельмі яркія. Вітаўт жа — воін! Прычым калі я ўбачыў галоўных выканаўцаў роляў, то я зразумеў: усе Вітаўты! Артысткі, якія танцуюць Ганну, — усе трапяткія. Ядвіга — валявая, з характарам. А якія Ягайлы! Таксама з характарам, хоць гэты вобраз больш цёмны. Але яны з Вітаўтам браты. Бывае такое, што адзін брат хуліган, а другі — выдатнік. Мы пастараліся ўсе вобразы зрабіць вельмі рэльефнымі: калі кахаць, то так, што на разрыў нерву. Калі біцца — то насмерць.

— Ці вывучалі вы тую эпоху, пра якую збіраліся пісаць музыку?

— Так, але, хоць ёсць гісторыя, нам усё ж цяжка пранікнуць туды, каб адчуць, што там было і як. Мы можам здагадвацца пра тыя пачуцці, якія кіравалі людзьмі. Таму справа ва ўражанні. І ў музычным таксама. Я вось так адчуў. І калі я спрабую адкруціць назад амаль сем стагоддзяў, то ў мяне яны гучаць вось так. У іншага кампазітара яны будуць гучаць інакш, у трэцяга — у адпаведнасці з яго светаадчуваннем і ўспрыманнем гісторыі... Але справа не толькі ў гістарызме. Для мяне істотнай была гісторыя характараў, пачуццяў — тое вечнае, што важна для мастацтва. У якія вякі мы ні зазіралі б, мы іх лепш можам адчуць менавіта праз людзей, якія тады жылі, праз іх дзеянні, у аснове якіх — характар. Яго мы можам паказаць праз нейкія перажыванні, страсці. У нас аснова сюжэта, героі — гістарычныя. Але ж мы не ведаем дакладна, якія эмоцыі імі кіравалі ў якія моманты. Мы зрабілі варыянт: можа, вось такія... Але зноў-такі: нам так бачыцца з вышыні эпох.

— Многія патэнцыйныя гледачы балета памятаюць спектакль «Князь Вітаўт» паводле п'есы Аляксея Дударава Купалаўскага тэатра. Вы яго глядзелі?

— Не, не атрымалася. Але п'есу Дударава чытаў. Ён мне падараваў, падпісаў. Гэта і было першым крокам да стварэння балета. Прайшло ўсяго тры гады!.. Я выйшаў з Акадэміі музыкі, сустрэў Дударава. Паразмаўлялі. Потым ён патэлефанаваў мне, перадаў п'есу. Я пачытаў. Натхніўся. Вядома, стварэнне балета не было літаральным паводле п'есы. Той твор драматычны, але ў балеце няма слоў, а ёсць экспрэсія іншага кшалту, якая дапамагае гледачу разумець, што адбываецца. Таму дадаліся і з'явіліся чыста балетныя ідэі, якія б дапамаглі раскрыць сутнасць супрацьстаяння герояў Вітаўта і Ягайлы.

— Вы як аўтар дапамагалі пастаноўшчыку? Таму што музыку кожны чуе па-свойму.

— Вядома. Мы ўвесь час былі ў кантакце. Сустракаліся з пастаноўшчыкам Юрыем Траянам, з мастаком Эрнстам Гейдэбрэхтам (калі ён прыязджаў сюды з Германіі, дзе зараз жыве). З дырыжорам. З ранку да ночы я бываў на рэпетыцыях: прыходзілася нешта карэктаваць падчас працы. Адна справа — напісаць музыку. Але ж ёсць яшчэ артысты, якім танцаваць. Больш хуткі тэмп — для іх ужо ўсё мяняецца. Гэта мы глядзім балет і думаем: як прыгожа! А яны працуюць, вытрымліваюць каласальнае напружанне. Напрыклад, Адажыа не можа доўжыцца больш за пэўны час: артысты стамляюцца фізічна. А ў нас у балеце другое Адажыа вялікае. Імкнуліся скараціць, але самі выканаўцы сказалі: «Мы вытрымаем...»

— Дагэтуль у афішы тэатра быў гістарычны беларускі балет «Страсці» Андрэя Мдзівані ў пастаноўцы Елізар'ева. Ці глядзелі вы яго?

— Гадоў 15 таму. У мяне добрае ўражанне. Я адчуваю, што абавязкова знойдуць паралелі і ў харэаграфіі. Нічога страшнага. Мы так захапіліся працай, што вырашылі: зробім спектакль, а там ужо іншыя няхай мяркуюць. На тое і крытыкі... Але прафесіяналы (я спецыяльна запрашаў сваіх калег) бачаць прафесійныя хібы. А глядач павінен убачыць гісторыю. Ён не будзе думаць пра тое, як хто які жэст зрабіў. Калі гэта прабярэ, калі прымусіць скалануцца душу — значыць, сэнс ёсць.

— Вас як аўтара можна павіншаваць, таму што кампазітар піша твор і далёка не заўсёды ўпэўнены, ці адбудзецца яго прэм'ера.

— Так, у мяне ёсць шмат сачыненняў, якія я напісаў, а яны ляжаць. Вялікія, нават оперы. Прапанаваў, а мне кажуць: «Не наша тэма, пачакаем». Гэты спектакль мне прапанавалі. Тэатру спатрэбілася гістарычная тэма. Падабралася група: аўтар ідэі, добры мастак, пастаноўшчык. І была цудоўная трупа. Аркестр, дырыжоры. Заставалася ўсё злучыць. Што мы і рабілі.

— Цудоўна, што другі сезон у Вялікім тэатры адкрываецца прэм'ерай твора беларускага кампазітара. Летась — операй Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда», сёлета — балет «Вітаўт». Але гэта адзінкі. Што трэба зрабіць для таго, каб гэта стала сістэмай і слухачы маглі знаёміцца з творамі сучасных беларускіх кампазітараў?

— Я не хацеў бы, каб гэта вырашалася шляхам нейкага ўказання: маўляў, адзін балет ці опера на год... Але прыслухацца да кампазітараў трэба, калі яны прыносяць творы. Заказваць можна больш. Чаго ж пісаць «у стол»?.. Вось паглядзелі, што нейкі кампазітар цікава працуе: давайце яму закажам такую тэму, прапануем яму добрага лібрэтыста, мастака, створыцца каманда. І атрымаецца твор. Як у выпадку з «Вітаўтам»: гэта не столькі заказ, колькі выдатная прапанова. Гэта гонар для мяне...

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Кінакрокі

БЕЛЫЯ РОСЫ, БЕЛЫЯ РОСЫ!

На здымках фільма пра сямейныя каштоўнасці — атмасфера сямейная

— Ой, як тут весела! — шапчу я фотакарэспандэнту на здымачнай пляцоўцы кінапраекта «Белыя росы-2». Толькі што мы наслухаліся развясёлых жартаў ад майстра па святле, які раіў нам «берагчы прычоскі», пранесячы міма нейкае жудасна грувасткае абсталяванне. А пару хвілін таму мы былі пераканаы, што пачаўся пажар, бо адмысловая «дыма-машына», як мы яе ахрысцілі, выпускала незлічоную колькасць густога белага дыму. Аказалася, што ён патрэбны для больш праўдападобнай імітацыі дзённага асвятлення, каб падкрэсліць праламленне святла. Пылінкі там розныя ў паветры лётаюць, ведаеце.
— Весела, але не ўсім, — з наўмысна суровым выглядам прамаўляе мужчына з рацыяй у руках і ў форме, больш падобнай на форму ваеннага ў «гарачай кропцы». Гэта начальнік пляцоўкі. Ён адказвае за тэхніку бяспекі і сочыць, каб на здымках усё ішло як трэба. Ён прыкрыквае на прысутных, калі яны перашкаджаюць рэжысёру працаваць. Словам, кіно пачынаецца са здымак.

Насамрэч, цалкам верагодна, што назва ў фільма будзе зусім іншая. Але, прынамсі, аўтарам сцэнарыя будучай стужкі таксама з'яўляецца драматург Аляксей Дудараў. Роўна 30 гадоў таму ён напісаў сцэнарый для фільма «Белыя росы», які зняў рэжысёр Ігар Дабралюбаў. Напэўна, і сёння гэтая беларуская стужка ўзгадваецца ўсім нашым суайчыннікам, у якіх можна раптоўна запытацца пра любімы беларускі фільм.

«Белыя росы-2» нехта называе працягам фільма Дабралюбава, нехта — рымэйкам. Але стваральнікі сцвярджаюць, што гэта цалкам аўтаномны праект, падобны на славуты фільм хіба што дабрынёй і чысцінёй галоўнага пасылу. Ды і акцёры тут усе іншыя. З папярэдняга фільма ў гэты «перайшла» хіба што актрыса Ірына Ягорава. Вось і ўсё. Астатнія — новыя тыпажы, новыя твары. Юозас Будрайціс іграе Ходаса, Віктар Манаеў — суседа Ходаса Струка, Павел Харланчук іграе маладога і прабіўнога Бодзю, Яўгенія Жуковіч — закаханую ў Бодзю Паліну, аматарку прыроды і розных дзіўных рэчаў і з'яў. Таксама ў фільме задзейнічаны Ганна Палупанава, Андрэй Мярзлікін, Сяргей Жбанаў ды іншыя. Здымае фільм малады рэжысёр Аляксандра Бутар. Гэта яе дэбют у вялікім кіно. Да гэтага Аляксандра працавала на тэлебачанні ў Ягора Хрусталёва. Зрабіла шмат музычных кліпаў.

— Амаль уся беларуская эстрада прайшла праз нашы з Алегам рукі, — жартуе Аляксандра.

Алег — гэта аператар Алег Гірэль. І «Белыя росы-2» для яго таксама дэбют у вялікім кіно. Яны з рэжысёрам Аляксандрай Бутар шмат працавалі раней на іншых праектах і, наогул, сябруюць з сёмага класа школы. Дарэчы, тэлемюзікл «Паўлінка NEW» — таксама іх стварэнне.

Складана ацаніць, якім атрымаецца даволі амбіцыйны праект «Белыя росы-2», першапачаткова, увогуле, заяўлены на адкрытым рэспубліканскім конкурсе нацыянальных кінапраектаў Міністэрства культуры як нацыянальны. Але ў выніку на кінастудыі «Беларусьфільм» стужка ствараецца як дэбютны праект. Прычым 70% бюджэту фільма складаюць дзяржаўныя грошы, а 30% — унёсак кінастудыі. Яе дырэктар Алег Сільвановіч з'яўляецца прадзюсарам стужкі.

Мы з фотакарэспандэнтам правялі ў павільёне «Беларусьфільма» бадай цэлы дзень. Атрымлівалі задавальненне ад здымачнага працэсу. Сапраўды, кіназдымкі — гэта нешта неверагоднае. Гучыць, вядома, не арыгінальна, але так ёсць. Атмасфера на «Белых росах-2» пануе хоць і крэатыўна-сямейная, але ўсё адно, як на любых здымках, набліжана да надзвычайнай. Выпадковы чалавек можа і спалохацца: маўляў, што гэта за людзі ў камуфляжнай вопратцы, з рацыямі, гучнагаварыцелямі і кучай назіральнай тэхнікі?

Вось так мэтанакіравана рэжысёр Аляксандра БУТАР працуе з вядомым артыстам Віктарам МАНАЕВЫМ.

Яўгенія ЖУКОВІЧ ужываецца ў вобраз Паліны — малюе партрэт каханага пяском.

Насамрэч, гэта нармальна. Сёння, вядома, ніхто ўжо не верыць у Дзеда Мароза і хаця б прыблізна ўсведамляе, што кіно — гэта вялікая ілюзія. Але як цікава назіраць, калі здымаецца кранальная сцэна, напрыклад, у якой гераіня Яўгеніі Жуковіч Паліна малюе партрэт героя Паўла Харланчука Бодзі пяском на падлозе ў сваёй хаце, а вакол мітусяцца людзі, якія не трапляюць у кадр. Яны п'юць каву, каб сагрэцца, вырашаюць нейкія тэхнічныя пытанні, жартуюць, крычаць, посяць фоткі ў «інстаграм», і наогул ім і справы нібыта няма да ўнутранай трагедыі гераіні. Вось яна — магія кіно.

Працоўны момант. Аператар Алег ГІРЭЛЬ, рэжысёр Аляксандра БУТАР і акцёр Віктар МАНАЕЎ (справа налева) у працэсе абмеркавання.

Увогуле, на здымках фільма пра традыцыйныя каштоўнасці — сям'ю, зямлю, сонца ды неба — пануе атмасфера любові.

— Ведаеце, акцёры, яны як дзеці, — распавядае **рэжысёр Аляксандра БУТАР**. — Ім заўжды хочацца, каб іх пашкадавалі, зразумелі, суцешылі. Я гэтым і займаюся, таму што вельмі люблю з імі працаваць.

Нават такія самавітыя майстры, як літовец Юозас Будрайціс і беларус Віктар Манаеў, добра вядомыя сваімі дасягненнямі перад тэатрам і кіно, у адзін голас сцвярджаюць, што такой пяшчотнай атмасферы на здымках мужчына-рэжысёр стварыць бы не здолеў.

У сталіцы здымкі працягнуцца да 27 верасня. І акрамя павільёнаў кінастудыі, здымачная група пабывае на кватэры, у клубе, у аэрапорце і офісе. Цікава, што ў начным клубе будуць здымаць не толькі эпізод, дзе галоўныя героі Бодзя і Русачэнка адзначаюць сваю першую перамогу на шляху да фінансавага поспеху, але музычны кліп грута «J:mors». Справа ў тым, што песня Уладзіміра Пугача «Дажджамі» стане саўндтрэкам да фільма, а кліп, у якім Пугач, Харланчук, Жбанаў і Мярзлікін спяваюць гэтую песню, — своеасаблівай прома-акцыяй да прэм'еры стужкі.

Застаецца толькі спадзявацца, што фільм сапраўды атрымаецца добрым і светлым і гледачы не забудуць пра яго акурат пасля паказаў у кінатэатрах абласных цэнтраў нашай радзімы. Бо размовы пра тое, што давер да беларускага кіно трэба вяртаць, ідуць даўно.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ. Фота Надзеі БУЖАН.

Падрабязны фотарэпартаж са здымак шукайце на сайце газеты.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

Организатор аукциона —

СМИЛОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Местополож. земельного участка	Кадастровый номер	Площ. зем-го уч-ка, га	Характеристика расположенных на участке строений. Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальн. цена объекта в бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Сумма, подлеж. возмещ. затрат на оформл. и регистр. участка, руб.
Минская обл., Червенский р-н, д. Корзуны, уч. № 28	625883504101000442	0,1500	Участок свободен от застройки. Имеется асфальтированная подъездная дорога, возможность подключения централизованного водоснабжения и водоотведения	45 196 250	4 519 600	4 516 300 + затраты за размещ. сведений в СМИ
Минская обл., Червенский р-н, д. Верхлес, ул. Центральная, уч. № 5	625883500601000120	0,1423	Участок свободен от застройки. Имеется подъездная дорога	21 197 850	2 119 800	3 678 600 + затраты за размещ. сведений в СМИ
Минская обл., Червенский р-н, д. Верхлес, ул. Центральная, уч. № 6	625883500601000121	0,1423	Участок свободен от застройки. Имеется подъездная дорога	21 197 850	2 119 800	3 678 600 + затраты за размещ. сведений в СМИ

1. Аукцион состоится **7 октября 2013 г. в 11.00** в здании Смиловичского сельского исполнительного комитета по адресу: Минская область, Червенский район, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, 8.

2. Условия проведения аукциона — наличие не менее двух участников.

3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 5%.

4. Для участия в аукционе граждане предоставляют в комиссию по проведению аукционов заявление; копию заверенного банком платежного документа о внесении задатка; документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; доверенность, удостоверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

5. Сумма задатка в размере 10% от кадастровой стоимости перечисляется в срок до 4 октября 2013 г. (включительно) на расчетный счет № 3600632102707, в ЦБУ № 627 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Червень, УНН 600008278, ОКПО 04432570, назначение платежа — 4901. Оплата осуществляется в г.п. Смиловичи.

6. Победитель аукциона обязан:

Оплатить в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона, внести плату за земельный участок и возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона по оформлению и государственной регистрации создания земельного участка, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

7. Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельным участком путем выезда к месту нахождения этого участка.

Заявления на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Червенский район, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, 8, посисполком, кабинеты №№ 2, 3.

Прием заявлений заканчивается **4 октября 2013 г.**

Контактные телефоны: **(8 01714) 23236, 23458, 21588.**

ООО «БелИнвестОценка» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Дорстройиндустрия»

ЛОТ № 1: **имущество участка «Загуздье» филиала «Нерудстройматериалы», расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, д. Вировля в составе:** Земельного участка с кадастровым номером **221881801101000001** площадью 10,6612 га для размещения объектов промышленности (наличие ограничения (обременения) прав в использовании земли – охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000 В., код – 13,2, площадь – 0,2483 га), мастерской, насосной, склада, административного здания и столовой, площадкой возле административного здания асфальтобетонной, котельной с металлической трубой, весовой и гаража, зданием корпуса грохочения с галереей, площадкой под галереей бетонной, трансформаторной, здания корпуса вторичного дробления с тремя галереями, здания корпуса первичного дробления с галереей, здания корпуса третичного дробления, очистных сооружений, артскважины бесфильтровой глубиной 86 м, ограждения металлического, водонапорной башни металлической емкостью 15 куб.м, противопожарного резервуара железобетонного емкостью 150 куб.м, сетей электроснабжения протяженностью 3405 метров, слаботочных сетей протяженностью 85 метров, водонапорной сети протяженностью 420 метров, канализационных сетей протяженностью 258 метров, тепловой сети протяженностью 22 метра: четырех емкостей металлических для дизельного топлива объемом 16 куб.м, двух емкостей металлических для бензина объемом 14 куб.м, Трансформатор ТМГ 400 10,04. Начальная цена продажи **345 083 004 рубля***. Задаток для участия в аукционе – **34 508 300** рублей. **Начальная цена продажи снижена на 20%.**

ЛОТ № 2: имущество производственной базы филиала ГСЗ «Омневичи», расположенное по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Почаповский с/с, 2,2 км северо-восточнее д. Застаринье в составе: Земельного участка с кадастровым номером **120400000001000221** площадью 5,0290 га для обслуживания производственной базы (наличие ограничения (обременения) прав в использовании земли – нет), производственно-бытового корпуса, склада хранения инвентаря, склада материалов, электрощитовой, запровочной ГСМ, склада ГСМ, помещения сторожки, эстакады для осмотра и ремонта автомобилей, трубы дымовой, пожарного резервуара, линий электропередачи, канализационной сети, кранбалки грузоподъемностью 5 т, оборудования трансформаторной подстанции.

Начальная цена продажи **634 240 846 рублей***, задаток для участия в аукционе – **63 424 085** рублей.

ЛОТ № 3: дробилка КСД-1200т (инв. № 9440, 1990 года выпуска) филиала ГСЗ «Боруны».

Начальная цена продажи **393 480 000 рублей***, задаток для участия в аукционе – **39 348 000** рублей.

